Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 91 (6067) | 21 красавіка 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Выкаранім ворагаў народа—трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных шпіёнаў і шкоднікаў, наймітаў замежных разведак! Смерць здраднікам радзімы!

Выкрыем усіх і ўсякіх двурушнікаў! Ператворым нашу партыю ў непрыступную крэпасць большэвізма!

(З ПЕРШАМАЙСКІХ ЛОЗУНГАЎ ЦК ВКП(б)

СТАЛІНСКІЯ КЛОПАТЫ АБ КАЛГАСНЫМ СЯЛЯНСТВЕ

Учора апублікаваны пастановы Совета Народных Камісараў Саюза ССР і ЦК ВКП(б) «Аб забароне выключэння калгаснікаў з калгасаў», «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах» і «Аб падатках і іншых абавязацельствах у адносінах аднаасобных гаспадарак». Усе гэтыя пастановы, наскрозь прасякнутыя сталінскімі клопатамі аб калгасным сялянстве, сустракаюць самы гарачы водгук і выклікаюць новы прыліў палітычнага і вытворчага ўздыму ў калгаснай вёсцы.

Сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі—закон жыцця і росту заможнасці калгаснай вёскі. Правільна спалучаючы асабістыя інтарэсы членаў арцелей з грамадскімі інтарэсамі ў калгасе, ён мабілізоўвае масы на добрасумленную, адданую работу, на барацьбу за далейшы росквіт калгаснай вёскі.

На жаль, у многіх мясцах дапушчаны буйнейшыя скажэнні статута сельскагаспадарчай арцелі. Гэтыя скажэнні выразіліся ў няправільных выключэннях з калгасаў. «Праверкай устаноўлена,—гаворыцца ў пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б),—што пераважная большасць выключэнняў з калгасаў з'яўляецца зусім неабгрунтаванай і праводзіцца без якіх-небудзь сур'ёзных повадаў, па самых малаважных матывах».

Многа выпадкаў агульнага, незаконнага выключэння з калгасаў ёсць і ў нашай рэспубліцы. Па даных Наркамзема БССР, за мінулы год з калгасаў выключана 4.066 калгаснікаў. Фактычна выключана яшчэ больш. Наркамазем нават не паклапаціўся прааналізаваць прычыны выключэнняў, ён абмежаваўся рэгістрацыяй фактаў, хапя сігналаў аб няправільных выключэннях з калгасаў больш чым дастаткова.

«У аснове такой практыкі,—гаворыцца ў пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б),—ляжаць фармальныя і бяздушна-бюракратычныя адносіны многіх кіруючых работнікаў калгасаў, а таксама партыйных і совецкіх кіраўнікоў раёнаў да лёсу жывых людзей, да лёсу асобных калгаснікаў».

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) наносіць руйнуючы ўдар па бяздушна-бюракратычных адносінах да лёсу калгаснікаў.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б)—узор чулых большэвіцкіх адносін да людзей. Совецкае сялянства навечна завязала свой лёс з калгасным ладам, актыўна будуе новае, сацыялістычнае жыццё, і партыя нікому і ніколі не дазволіць лёгкадумна адносіцца да лёсу калгаснікаў. СНК СССР і ЦК ВКП(б) папярэджваюць, «што за парушэнне гэтай пастановы вінаватыя будуць прыцягвацца да суда, як крымінальныя злачынцы».

Не менш важнае значэнне набывае пастанова «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах». Калгасны лад поўнасцю перамог. З кожным годам расце ўраджайнасць сацыялістычных палёў. Значна выраслі даходы калгасаў, калгаснікаў. Даходы гэтыя трэба правільна размеркаваць. Аднак праўленні многіх калгасаў, пры прамым патуранні з боку партыйных і совецкіх арганізацый, асноўную долю даходаў затрачваюць на пабудову грамадскіх будынкаў, на вытворчыя і адміністратыўныя выдаткі. З гэтай прычыны доля грашовых даходаў, якая размяркоўваецца на працадні калгаснікаў, аказваецца заніжанай. Наперакор статуту сельскагаспадарчай арцелі, сродкі выдаткоўваюцца не ў адпаведнасці з зацверджаным на агульным сходзе калгаснікаў каштарысам.

Такая практыка, якая ідзе ў разрэз з палітыкай партыі і ўрада, з інтарэсамі калгаснікаў, шырока распаўсюджана ў многіх калгасах нашай рэспублікі.

Вось, напрыклад, Церахоўскі раён. Тут 78 калгасаў. З іх у 52 калгасах на адміністратыўна-упраўленчыя патрэбы выдаткавана звыш 2 проц. і на капітальнае будаўніцтва—звыш 20 проц. грашовых даходаў калгасаў, хапя гэта пярэчыць статуту і накіравана супроць інтарэсаў калгаснікаў. Старшыні некаторых калгасаў распараджаюцца калгасным дабром, як ім уздумаецца, разбазарваюць яго. Запазычанасць розных арганізацый і ўстаноў калгасам складае 160 тыс. рублёў. Усё гэта прывяло да таго, што на працадні калгаснікі атрымліваюць зусім мала грошай, а ў 12 калгасах Церахоўскага раёна грошы зусім не размяркоўваліся на працадні.

Бяздзейнасць рэвізійных камісій, бескантрольнасць праўленняў калгасаў, апракідванне статута сельскагаспадарчай арцелі, ушчамленне інтарэсаў калгаснікаў, — усё гэта стварае спрыяючую глебу для шкодніцкай дзейнасці ворагаў, прахадзімцаў, жулікаў. Фактаў можна прывесці вельмі многа.

Запазычанасць розных устаноў і арганізацый калгасам рэспублікі складае 14.308 тыс. руб. Не цяжка зразумець, як гэта запазычанасць адбіваецца на працадні калгаснікаў. Такія і ім падобныя нецярпімыя факты намнога знізілі грашовую даходнасць калгаснікаў па працаднях. Асабліва мала размеркавана грошай па працаднях у Хоцімскім, Клічаўскім, Прапойскім, Кіраўскім, Бярэзінскім, Касцюковіцкім і Свяцілавіцкім раёнах.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) асудзілі антыкалгасную практыку бясклопатных адносін да працадня калгаснікаў і растранжырвання калгасных даходаў на празмерныя капітальныя, вытворчыя і адміністратыўна-гаспадарчыя выдаткі. «Нашы партыйныя і совецкія кіраўнікі, —гаворыцца ў пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б), — абавязаны памятаць, што ў радзе месц на штучнае раздуванне вытворчых і капітальных затрат у калгасах і заніжэнне грашовых даходаў, размяркоўваемых па працаднях, свядома штурхалі сядзеўшыя ў зямельных і іншых органах ворагі народа ў правакацыйных мэтах, каб падарваць калгасы».

Перамогі калгаснага ладу, рост даходнасці калгасаў, умацаванне іх грамадскіх фондаў стварылі ўсе магчымасці скараціць адлічэнні з даходаў калгасаў у іх грамадскія фонды, на капітальныя і вытворчыя затраты і павялічыць размеркаванне грашовых даходаў калгасаў на працадні. У сувязі з гэтым СНК СССР і ЦК ВКП(б) скасавалі існуючы парадак размеркавання грашовых даходаў арцелей, прадугледжаны ў статуце сельскагаспадарчай арцелі. Цяпер калгасы будуць размяркоўваць на працадні не менш 60—70 проц. усіх грашовых даходаў арцелей.

Каб зразумець значэнне гэтага мерапрыемства, дастаткова сказаць, што ў 1937 годзе на працадні калгаснікаў па рэспубліцы размеркавана толькі 38,4 проц. грашовых даходаў калгасаў. Павелічэнне, прыкладна, у два разы!

Пастановаю СНК СССР і ЦК ВКП(б) прадугледжан цэлы рад мерапрыемстваў, якія забяспечаць рэзкае павышэнне грашовых даходаў калгаснікаў. СНК СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі «прыцягваць да крымінальнай адказнасці асоб, вінаватых у незаконным выдаткоўванні калгасных сродкаў, якія ідуць у парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі і інтарэсаў калгаснікаў, разглядаючы гэтыя дзеянні, як здраду справе калгасаў і дапамогу ворагам народа».

Разам з гэтым, СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову «Аб падатках і іншых абавязацельствах у адносінах аднаасобных гаспадарак». СНК СССР і ЦК ВКП(б) адзначылі, што партыйныя і совецкія арганізацыі дапусцілі буйныя памылкі ў адносінах да аднаасобнікаў, што выразілася ў такой практыцы, калі аднаасобнікі фактычна ускальзаюць ад выканання дзяржаўных абавязацельстваў, чым наносіцца прамая перашкода справе далейшага ўпянення аднаасобных гаспадарак у калгасы. Партыйным і совецкім арганізацыям прапанавана выправіць памылкі, якія дапушчаны ў адносінах да аднаасобнікаў.

Пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) яшчэ больш мабілізуюць калгаснікаў на далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, на большэвіцкую барацьбу за высокі ўраджай, на ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ САЮЗА ССР

19 красавіка Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. М. І. Калінін у прысутнасці раду членаў Прэзідыума ўручыў ордэны лепшым майстрам азербайджанскага мастацтва.

Шумныя воплескі раздаюцца ў зале, калі тав. Калінін уручае ордэн Леніна Азербайджанскаму Дзяржаўнаму тэатру оперы і балета імя М. Ф. Ахундава. Ад імя дэлегацыі тэатра, прыняўшай ордэн Леніна, кароткае слова гаворыць дырэктар оперы тав. Абасаў.

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, народны артыст Саюза ССР кампазітар Гаджыбекаў, атрымліваючы ордэн Леніна, заяўляе:

— Перамогі азербайджанскага мастацтва — гэта знамення часу, гэта сведчанне росквіту мастацтва і культуры народаў Совецкага Саюза ў сталінскую эпоху.

Далей узнагароды ўручаюцца артыстам, рэжысёрам і іншым работнікам тэатра імя Ахундава.

Ордэны Саюза ССР атрымалі таксама асабліва адзначыўшыяся рэжысёры, сцэнарысты, артысты, мантажоры і рабочыя-стаханаўцы, узнагароджаныя ў сувязі з выпускам выдатных кінофільмаў — «Ленін у Кастрычніку», «Пётр І» і «Багатая нявеста».

Ад імя гэтай групы ўзнагароджаных выступіў з прамовай пісьменнік А. Н. Талстой.

Узнагароды былі ўручаны таксама ўдзельнікам экіпажа зверабойнага судна «Мурманец», раду камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і іншым.

Пасля ўручэння ордэнаў з прамовай выступіў тав. М. І. Калінін. (БЕЛТА).

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ АРМЯНСКАЙ ССР

ЕРЭВАН, 16 красавіка. (БЕЛТА). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Армянскай ССР зацвердзіў склад акруговых выбарчых камісій па выбарах у Вярхоўны Совет Армянскай ССР.

У складзе камісій — партыйныя і непартыйныя большэвікі — дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, стаханаўцы прадпрыемстваў, прафесары, студэнты, сельскія настаўнікі. Значная частка зацверджаных таварышаў працавала ў акруговых і ўчастковых камісіях па выбарах у Вярхоўны Совет СССР і мае багаты вопыт арганізацыйнай работы.

Усяго па 256 камісіях зацверджаны 2.816 чалавек, сярод іх — 43 проц. беспартыйных. Больш паловы членаў камісій — калгаснікі. У акруговых камісіях — 515 жанчын.

ФАБРЫКА „КОМУНАРКА" ВЫКАНАЛА ЧАТЫРОХМЕСЯЧНУЮ ПРАГРАМУ

Калектыў менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» з гонарам выканаў узятае на сябе абавязацельства па дастойнай сустрэчы першамайскага свята. 18 красавіка фабрыка датэрмінова выканала 4-месячную праграму на 101,5 проц. План выканан па ўсіх асартыментах. Усяго выпушчана прадукцыі на 8.700 тысяч рублёў.

Выпушчана і паступіла ўжо ў продаж 130.000 прыгожа афармленых першамайскіх дзіцячых падарункаў. Па метаду вядомай стаханаўкі тав. Юдзінай пачалі працаваць 117 завёртшчыц. Некаторыя з іх дасягнулі высокай прадукцыйнасці. Стаханаўка тав. Шнытко за змену завёртвае 90 кілограмаў цукерак (норма 51 кілограм). Да яе узроўню прыбліжаюцца стаханаўкі тт. Жэбрык, Сагалава, Боршч, Бейліна і інш.

Для аказання сацыялістычнай дапамогі на адстаючае кандзіцерскае прадпрыемства «Чырвоны мазуранін» паслан кваліфікаваны майстар тав. Сарокін.

Да канца месяца фабрыка «Комунарка» дасць звыш плана яшчэ на 800 тысяч рублёў прадукцыі.

ПРАЦОЎНЫЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ІСПАНІІ ГЕРАІЧНА ЗМАГАЮЦЦА ЗА СВАЮ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ. НА ЗДЫМКАХ: злева — каталонская моладзь ідзе на папаўненне радоў рэспубліканскай арміі; справа — камандзір дывізіі Валенціно Гонсалес, вядомы пад імем Кампесіно, узнагароджаны медаллю за гераічную барацьбу на арагонскім фронце.

НОТА ІСПАНСКАГА ЎРАДА СОВЕТУ ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 19 красавіка. (БЕЛТА). Сёння міністр замежных спраў Іспанскай рэспублікі Альварэс дэль Вайо прыслаў на імя генеральнага сакратара Лігі нацый наступную ноту:

«19 мая 1937 года Совет Лігі нацый прыняў рэзалюцыю, у якой, адзначаючы дзеянні Міжнароднага камітэта па неўмяшанню, накіраваныя на адкліканне ўсіх неіспанскіх удзельнікаў барацьбы ў Іспаніі, выказаў цвёрдую надзею, што ў рэзультаце гэтай ініцыятывы камітэта будуць прыняты меры, якія забяспечаць як мага хутчэйшае адкліканне з Іспаніі ўсіх неіспанскіх добраахвотнікаў.

У прадстаўленым 2 кастрычніка 1937 года пленуму Лігі нацый яго шостым камітэтам праекце рэзалюцыі выказваўся жаль з поваду таго, што камітэту па неўмяшанню не ўдалося дабіцца адклікання неіспанскіх удзельнікаў вайны, і прызнавалася прысутнасць замежных армейскіх карпусоў на іспанскай тэрыторыі. У праекце выказвалася надзея на тое, што дыпламатычныя дзеянні, прадпрынятыя некаторымі дзяржавамі незадоўга да гэтага, будуць паспяховымі і завершацца адкліканнем неіспанскіх удзельнікаў вайны. Праект таксама прадугледжваў, што, калі не ўдасца ў бліжэйшым будучым дабіцца такога рэзультата, члены Лігі нацый, якія прымаюць удзел у пагадненні аб неўмяшанні, разгледзяць пытанне аб спыненні палітыкі неўмяшання. Гэты праект рэзалюцыі не атрымаў аднагалоснай падтрымкі пленума і таму не мае юрыдычнай сілы. Аднак праект працягвае мець маральную сілу, якая выцякае з таго факта, што за яго галасавалі 38 дзяржаў — членаў Лігі нацый, уключаючы 12 з 14 членаў Совета.

Аднак з мая месяца 1937 года італьянская і германская інтэрвенцыя ў карысць іспанскіх мяцежнікаў прадаўжае значна расшырацца як колькасна, так і якасна. Неаспрэчныя доказы гэтай інтэрвенцыі вядомы ўсяму свету. Факты італа-германскай інтэрвенцыі выклікалі абурэнне суседнай грамадскай думкі. Апрача таго, урад Іспанскай рэспублікі мае канкрэтную інфармацыю аб паглыбленні італа-германскай інтэрвенцыі, і гэту інфармацыю ён мяркуе прадставіць на разгляд Совета.

З часу пленума Лігі нацый значна ўзмоцнілася пагроза ўсеагульнаму міру. Гэту пагрозу, якая ствараецца нарастаючай замежнай інтэрвенцыяй ў Іспаніі, як вядома, яшчэ год таму назад Совет Лігі знайшоў патрэбным падкрэсліць».

У заключэнне ў ноце гаворыцца, што міністэрства замежных спраў Іспаніі просіць генеральнага сакратара Лігі ад імя іспанскага ўрада зноў уключыць пытанне аб замежнай інтэрвенцыі ў Іспаніі ў парадак дня чарговай сесіі Совета, якая адкрыецца ў Жэневе 9 мая.

ІСПАНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ НА ПЕРШАМАЙСКІХ УРАЧЫСТАСЦЯХ У МАСКВЕ

БАРСЕЛОНА, 19 красавіка. (БЕЛТА). Па паведамленню агенцтва Эспанья, у Барселоне арганізавана іспанская дэлегацыя, якая будзе прысутнічаць на першамайскіх урачыстасцях у Совецкім Саюзе. Дэлегацыя складаецца з дэпутатаў іспанскага парламента, прадстаўнікоў розных профсаюзаў і іншых грамадскіх і рабочых арганізацый рэспубліканскай Іспаніі.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (АРАГОНСКІ) ФРОНТ

Паводле паведамлення іспанскага міністэрства абароны, у сектары Трэмп (на поўнач ад Лерыды) прадаўжаліся атакі мяцежнікаў. Агенцтва Эспанья адзначае, што ў гэтым горным раёне фашысты, сканцэнтраваўшыя значныя тэхнічныя сродкі, не могуць, аднак, прымяняць танкаў і цяжкай артылерыі. Усе іх спробы прасунуцца ў гэтым раёне астаюцца безрэзультатнымі.

У сектары Тартоса (на міжземнаморскім узбярэжжы) рэспубліканскія войскі ўмацаваліся на пазіцыях, размешчаных на левым беразе ракі Эбро. На поўдзень ад Эбро фашысты, падтрымяныя буйнымі сіламі авіяцыі і танкаў, прадпрынялі атакі паміж Бенікарло і Капі (на захад ад Вінарос). Гэтыя атакі былі рэспубліканцамі адбіты. Працяжнік змог крыху прасунуцца толькі ў напрамку да Тырыг (на паўднёвы захад ад Сан Матсо). Два фашысцкія танкі згарэлі, некалькі танкаў было разбіта і астатнія вымушаны былі ўцячы.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Паводле паведамлення агенцтва Эспанья, 19 красавіка раніцой 6 трохматорных самалётаў італьянскай авіяцыйнай базы на востраве Маёрка прабавалі бамбардыраваць Барселону. Загараджальны агонь зенітных батарэй і рэспубліканскія знішчальныя самалёты адагналі самалёты мяцежнікаў. Аднак, самалёты мяцежнікаў скінулі на прадмесці горада, прылягаючыя да мора, каля 30 бомб, якімі разбурана некалькі дамоў. Налічваецца некалькі забітых і раненых.

***

БАРСЕЛОНА, 19 красавіка, (БЕЛТА). Па паведамленню агенцтва Гавас, у апошніх паветраных баях на ўсходнім фронце рэспубліканцы захапілі ў палон 39 фашысцкіх лётчыкаў. Амаль усе яны аказаліся немцамі і італьянцамі.

РОСТ АНТЫФАШЫСЦКІХ НАСТРОЯЎ У ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 20 красавіка. (БЕЛТА). Учора ў Празе адбыўся выпадак, які ярка ілюструе антыфашысцкія настроі рабочых Чэхаславакіі.

Саветнік германскага пасольства Генке вывесіў у акне сваёй кватэры германскі фашысцкі сцяг. Група рабочых бліжэйшай будоўлі патрабавала зняцця сцяга. Пасля адмаўлення ў гэтым рабочыя закідалі каменнем вокны кватэры. Паліцыя арыштавала 8 рабочых і 2 жыльцоў дома, якія выражалі абурэнне вывешваннем сцяга фашысцкай Германіі.

Міністэрства замежных спраў Чэхаславакіі выразіла германскаму пасольству свой жаль з поваду інцыдэнта і абяцала «дабіцца адпаведнага пакарання рабочых». Рабочы друк пратэстуе супроць дзеянняў паліцыі і патрабуе неадкладнага вызвалення арыштаваных.

Іспанскі народ будзе змагацца да перамогі

ПАРЫЖ, 20 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Эспанья, комуністычны дэпутат іспанскага парламента Антоніо Міхе, які знаходзіцца ў Валенсіі, заявіў журналістам:

«Вораг памыліўся, калі ён спадзяваўся перарывам зносін паміж Каталоніяй і астатняй рэспубліканскай Іспаніяй нанесці ўдар баявому духу рэспубліканцаў. Вера антыфашысцкіх мас Іспаніі ў перамогу непахісна, і выключная мабілізацыя, якая робіцца ў паскораных тэмпах па ўсёй краіне, гэта наглядна даказвае».

ПЕРАД ДНЁМ 1 МАЯ У ШВЕЙЦАРЫІ

ЖЭНЕВА, 20 красавіка. (БЕЛТА). Орган швейцарскай компартыі «Фрэйхейт» паведамляе, што між компартыяй, сацыялістычнай партыяй і профсаюзамі дасягнута пагадненне аб правядзенні ў горадзе Базелі алзінай народнай дэманстрацыі ў дзень 1 мая. Газета публікуе ў сувязі з гэтым зварот да працоўных Базеля, у якім падкрэсліваецца выключнае значэнне дня 1 мая для мабілізацыі ўсіх народных антыфашысцкіх сіл на барацьбу за мір і дэмакратыю, супроць фашысцкай агрэсіі, пагрозы новай вайны і для ўзмацнення салідарнасці з Іспанскай рэспублікай.

Фашысцкая змова ў Румыніі

БУХАРЭСТ, 19 красавіка. (БЕЛТА). Следствам па справе аб узброеным выступленні (путчы), якое рыхтавала фашысцкая «Жалезная гвардыя» (агенты германскага фашызма), устаноўлена, што фашысты ў ноч на 17 красавіка збіраліся захапіць пошту, тэлеграф, тэлефон і радыё, урадавыя ўстановы, станцыю чыгункі, банк і іншыя пункты, арыштаваць караля і членаў урада.

Урад прадставіў павятовым прэфектам (начальнікам паліцыі) неабмежаваныя поўнамоцтвы.

Фашысцкую змову «Жалезнай гвардыі» румынскі ўрад выкарыстоўвае для барацьбы супроць усіх апазіцыйных партый. Следчым органам даручана «ўстанавіць сувязь» паміж «Жалезнай гвардыяй» і партыяй нацыянал-цараністаў (сялянскай партыяй). У поўнамоцтвы прэфектаў уваходзіць ліквідацыя ўсіх «экстрамісцкіх», гэта значыць апазіцыйных арганізацый. У той-жа час глава «Жалезнай гвардыі» Кодрэану і іншыя важакі рыхтаваўшагася путча ўтрымліваюцца толькі пад «хатнім арыштам».

***

ПАРЫЖ, 20 красавіка. (БЕЛТА) Як перадае газета «Эўр», дакументы, захопленыя ў час арышту кіраўніка румынскай «Жалезнай гвардыі» Кодрэану, паказваюць, што фашысцкі путч, які рыхтаваўся «Жалезнай гвардыяй», быў поўнасцю арганізаван у Германіі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

ЗВЕРСТВЫ ЯПОНСКІХ ЗАХВАТЧЫКАЎ

НЬЮ-ЕРК, 10 красавіка. (БЕЛТА). Газета «Нью-Ерк таймс» змясціла артыкул карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд прэс аб японскіх зверствах у Паўночным Кітаі.

Карэспандэнт піша, што ў адказ на актыўныя дзеянні кітайскіх партызан у раёне Бэйпін-Ханькоускай чыгункі японцы пачалі сістэматычнае знішчэнне кітайскіх вёсак. За апошнія месяцы японцамі ў гэтым раёне было спалена звыш 200 вёсак і забіты тысячы сялян.

Каля 40 тысяч сялян, ратуючыся ад японскіх варвараў, пакінулі свае сёлы і хаваюцца ў горах ці ўступілі ў партызанскія атрады.

Самую жудасную карціну ўяўляе сабою сяло, размешчанае на рацэ Хутэхэ. Да японскага ўрывання ў гэтым сяле жылі 4 тысячы чалавек. 27 лютага 300 японскіх салдат, прыбыўшых на грузавіках, без усякага поваду адкрылі па сялу агонь з гармат і кулямётаў. Сяляне, якія ратаваліся, бязлітасна расстрэльваліся.

Некалькі соцень чалавек утанула пры спробе пераправіцца цераз раку. Каля двух тысяч сялян, якія асталіся жывымі, уцяклі да партызан».

БОЛЬШЭВІЦКАЙ БАРАЦЬБОЙ ЗА СТАЛІНСКІ ЎРАДЖАЙ АДКАЖАМ НА ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б)

З вялікім уздымам калгаснікі сельгасарцелі імя Дзержынскага, Менскага раёна, сустрэлі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб забароне выключэння калгаснікаў з калгасаў» і «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах».

У сваіх выступленнях на агульным сходзе калгаснікі дзякавалі роднаму таварышу Сталіну і яго вернаму сратніку таварышу Молатаву за іх бацькаўскія клопаты аб калгасніках.

Калгаснік тав. Макасаў у сваім выступленні на сходзе заявіў:

— Усе нашы калгаснікі аднадушна вітаюць гэтыя пастановы. З кожным годам расце наша заможнасць. У 1937 годзе я, напрыклад, на свае працадні атрымаў 11 цэнтнераў зернавых, 60 цэнтнераў бульбы, 72 цэнтнеры гародніны і 1800 рублёў грашыма. У сувязі з пастановаю партыі і ўрада, каб на працадні калгаснікам выдалі не менш 60—70 проц. грашовых даходаў калгаса, я ўпэўнен, што ў будучым годзе атрымаю намнога больш грошай.

***

Учора ў першай брыгадзе калгаса імя Молатава, Прыгараднага сельсавета, Менскага раёна, адбыўся мітынг калгаснікаў з поваду апублікавання пастаноў СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб забароне выключэння калгаснікаў з калгасаў» і «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах». На мітынгу прысутнічала 50 чалавек. Калгаснікі горача сустрэлі гэтыя гістарычныя пастановы, якія накіраваны на далейшае ўмацаванне калгасаў і рост заможнасці калгаснікаў.

У прынятай рэзалюцыі калгаснікі пішуць:

«Мы горача вітаем гэтыя гістарычныя пастановы, якія накіраваны на далейшы росквіт калгасаў. Мы, калгаснікі калгаса імя Молатава, як і ўсе калгаснікі Совецкай Беларусі, штодня адчуваем клопаты аб нас большэвіцкай партыі, совецкай улады і сабіста таварыша Сталіна.

Мы, калгаснікі, з усёй рашучасцю адзначаем, што і ў нашым калгасе былі дапушчаны вялікія памылкі ў пытанні выключэння калгаснікаў з калгаса. Так, няправільна выключаны з калгаса Пятро Гук і Савіцкая. Пры выключэнні іх з калгаса мы не праявілі дастатковай чуласці і гэтым самым парушылі статут сельгасарцелі.

У адказ на пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), абавязваемся яшчэ больш узмацніць барацьбу за сталінскі ўраджай, каб зрабіць наш калгас большэвіцкім, а калгаснікаў заможнымі. Мы абавязваемся дабіцца высокага ўраджаю, каб павысіць кошт працадня калгасніка. Мы маем усе ўмовы, каб у гэтым годзе атрымаць на працадзень 5 кілограмаў збожжа і 6 рублёў грашыма. Яшчэ шырэй разгорнем стаханаўскі рух, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва!».

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

СМЯЛЕЙ РАЗГОРТВАЦЬ КРЫТЫКУ І САМАКРЫТЫКУ

Бюро Кагановіцкага горрайкома ў адпаведнасці з рашэннем ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б прыступіла да правядзення справаздачна-выбарчых партыйных сходаў з 10 красавіка. Папярэдне да справаздачна-выбарчых партсходаў вялася падрыхтоўчая работа. Ва ўсіх пярвічных партарганізацыях раёна камуністы дэталёва вывучалі пастанову ЦК ВКП(б), інструкцыю аб правядзенні выбараў кіруючых партыйных органаў і перадавы артыкул газеты «Правда» ад 30 сакавіка.

Прайшоў год з часу выбараў у партыйныя органы. За гэты год наша партыя пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, узброеная гістарычным рашэннем лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б), правяла велізарную работу па ачыстцы сваіх радоў ад ворагаў народа, трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў і іншых агентаў фашызма і замежных разведак.

За гэты год наша краіна пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна паднялася на новую ступень социялістычнага дэмакратызма. На аснове самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі выбран Вярхоўны Совет СССР. Атрымана гістарычная перамога блока камуністаў і беспартыйных. Гэты блок стаў найвялікшай сілай у нашай краіне, ён з'яўляецца фактарам моцнай, непарушнай сувязі большэвіцкай партыі з масамі.

Нязмерна вырас аўтарытэт нашай партыі. Вакол партыі вырас новы шматлікі актыў, праверан на грамадскай рабоце — у часе выбараў у Вярхоўны Совет у якасці агітатараў, даверaных, членаў і старшынь выбарчых камісій. Вялікая колькасць з іх вылучана на кіруючую гаспадарчую, совецкую і партыйную работу.

Партарганізацыя Кагановіцкага раёна гор. Менска прышла да выбараў кіруючых партыйных органаў, як і ўся партыя, — маналітнай, адзінай, моцна згуртаванай, вернай да канца справе партыі Леніна—Сталіна, справе Сталінскага Цэнтральнага Камітэта.

У раёне за перыяд з 10 па 20 красавіка праведзены справаздачна-выбарчыя партсходы ў 32 партарганізацыях, сярод іх рад буйных партарганізацый, як-та: фабрыкі «Кастрычнік», імя Тэльмана, шклозавода, Соўнаркома, Наркамюста і інш.

Сходы ў асноўным праходзяць арганізавана, пад знакам высокай палітычнай актыўнасці. На справаздачна-выбарчыя партсходы з'яўляецца амаль 100 проц. комуністаў.

На справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі фабрыкі «Кастрычнік» з'явілася 96 проц. членаў партыі. Памяшканне клуба, дзе праходзіў партсход, было добра падрыхтавана. У спрэчкі па справаздачнаму дакладу запісалася 51 чалавек, выказалася 46 таварышаў. Яны з усёй большэвіцкай праматой, па-дзелавому крытыкавалі работу парткома і райкома.

Некаторыя парторгі і сакратары парткомаў фармальна падышлі да падрыхтоўкі справаздачна-выбарчых партсходаў. Парторг партарганізацыі Белторфа т. Жукаў умудрыўся свой справаздачны даклад зрабіць за 15 мінут. Ён нічога не сказаў аб фактах вылазак і варожай рабоце на прадпрыемстве. А гаварыць было аб чым. Нават пасля студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) партарганізацыя аказалася не ў сілах выкрыць сапраўдных ворагаў і іх пасобнікаў — паклёпнікаў, комуністаў-кар'ерыстаў. Тав. Жукаву добра было вядома аб тым, што член партыі Саўковіч праз паклёп на комуністаў дабіваўся зацверджання яго дырэктарам Белторфа. Аднак, тав. Жукаў не даў гэтай справе адпаведнай палітычнай ацэнкі.

І зусім правільна комуністы выступілі з рэзкай большэвіцкай крытыкай работы і справаздачнага даклада парторга. Сход рашыў адкласці справаздачна-выбарчы сход і прапанаваў парторгу добра падрыхтавацца да справаздачы.

Не лепш абстаяла справа з падрыхтоўкай да партсхода ў партарганізацыі СНК БССР. На справаздачна-выбарчы сход з'явілася толькі 80 проц. комуністаў, сход адкрыўся са спазненнем на паўтары гадзіны. Сакратар парткома тав. Александраў за 50 мінут зрабіў справаздачу, ні слова не сказаўшы аб тым, як партарганізацыя выконвае пастановы студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), як выпраўляе памылкі, якія дапусціў партком пры разборы спраў комуністаў аб выключэнні іх з партыі.

Выбары кіруючых партыйных органаў з'яўляюцца буйнейшай і сур'ёзнейшай праверкай партыйнай работы. Кіраўнікі партыйных арганізацый трымаюць зараз палітычны экзамен перад партыйнай масай; экзамен, які павінен паказаць, як кожны кіраўнік згуртоўваў большэвікоў на барацьбу за генеральную лінію партыі, як змагаўся і выкараняў трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, нацыянал-фашысцкіх агентаў і іншых подлых ворагаў народа.

Самае галоўнае — правесці выбары на высокім палітычным узроўні, смела вылучаць маладыя кадры, дабіцца, каб ні адзін вораг, ні адзін сумніцельны чалавек не прабраўся ў партыйныя органы.

Пры вылучэнні і абмеркаванні кандыдатур у кіруючыя партыйныя органы павінен прымяняцца ленінска-сталінскі прынцып падбору кадраў. Ацэньваць людзей трэба па іх палітычных і дзелавых адзнаках, па таму, як яны палітычна выхоўваюць масы, як яны вырашаюць палітычныя і гаспадарчыя задачы, стаячыя перад імі.

Ажыццяўляючы гэты асноўны прынцып, большэвікі Кагановіцкага раёна г. Менска з гонарам выканаюць пастанову ЦК ВКП(б), выберуць у кіруючыя партыйныя органы добра праверaных большэвікоў, бязмежна адданых нашай партыі, выпрабаваных у барацьбе з ворагамі народа і здольных да канца абараняць справу комуністычнай партыі.

П. САВІЦКІ.

выконваючы абавязкі сакратара Кагановіцкага горрайкома КП(б)Б.

ПРАВІЛЬНА СПАЛУЧАЦЬ УНУТРЫПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ З КЛОПАТАМІ АБ ВЫТВОРЧАСЦІ

(Гомельскі шклозавод імя Сталіна)

Адной з буйнейшых у горадзе лічыцца партарганізацыя шклозавода імя Сталіна. 90 комуністаў налічвае яна.

1937 год завод закончыў ганебнымі паказальнікамі. План быў выканан толькі на 86,7 проц. Дзесяткі тысяч кубаметраў шкла недадана дзяржаве. Асноўная маса прадукцыі выпускалася нізкай якасці — 3-га сорту. Каля 30 проц. усёй выпушчанай прадукцыі ператваралася ў бой. 5 млн. рублёў страты за год — такі вынік злачыннага гаспадарання. Партыйная арганізацыя ў поўнай меры нясе адказнасць за дрэнную работу прадпрыемства.

На заводзе на працягу доўгага перыяду арудавалі мацёрыя шпіёны і дыверсанты. Усе цэхі былі паражаны шкодніцтвам. Органамі НКВД выкрыта і ізʼята гэта банда прэзрэнных ворагаў народа. Але ці да канца выкарчавана ахвосце варожай зграі, ці дастаткова рашуча ідзе барацьба за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва? Як партком узначаліў барацьбу з ворагамі, як мабілізаваў комуністаў на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці? Нарэшце, у чым прычына ўсё яшчэ дрэнай работы завода, невыканання плана і нізкай якасці прадукцыі?

На ўсе гэтыя пытанні трэба было чакаць адказу ў справаздачным дакладзе сакратара парткома тав. Каханоўскага, зробленага ім на сходзе 19 красавіка. Але дакладчык пастараўся абыйсці гэтыя пытанні. Даклад быў павярхоўны, «аб усім патроху», несамакрытычны, не мабілізуючы партарганізацыю на вырашэнне найадказнейшых гаспадарча-палітычных задач. Даклад быў пабудаван у духу агульнай канстатацыі таго, што ёсць. Ніякага палітычнага аналізу, абагульнення і вываду для партарганізацыі ён не зрабіў.

Між тым, пры больш сур'ёзных адносінах да даклада можна было ўскрыць прычыны ганебнай работы прадпрыемства, можна было назваць сяго-таго з комуністаў, віноўных у тых агіднасцях, якія прадаўжаюць тварыцца на заводзе. Зусім іншы вывад зрабіў-бы тады тав. Каханоўскі адносна таго, што нібы вынікі шкодніцтва ўжо ліквідаваны і ворагі ўсе выкрыты. Палітычна шкоднае заключэнне, якое зрабіў дакладчык, дэмабілізавала партыйную арганізацыю замест мабілізацыі яе на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці.

Дакладчык зачытаў шмат лічбаў: колькі партыйных школ арганізавана, ахват імі членаў партыі, колькі гурткоў працуе на выбарчым участку і ў цэхах, колькі ў іх займаецца, але ён не даў карціны фактычнага становішча партыйна-масавай палітычнай работы. А гэта якраз найбольш слабы ўчастак у рабоце парткома. Іменна ў гэтым трэба шукаць прычыну і дрэннай вытворчай работы.

Лічбы, паведамленыя ў дакладзе тав. Каханоўскага, разыходзяцца з сапраўднасцю. Арганізаваныя школы працуюць з перабоямі, наведванне вельмі слабае (ад 50 да 70 проц.). Асобныя комуністы (Кікас, Фельдман і інш.) месяцамі не наведваюць заняткаў. Якасць вучобы нізкая. Большасць спачуваючых зусім не ахоплена вучобай.

Заняткі гурткоў на выбарчым участку сістэматычна зрываюцца, не вызначаны пэўныя дні для правядзення іх. Кожны агітатар ідзе праводзіць гутарку, калі сам ўздумае. Партком не кіраваў гэтым адказнейшым участкам.

Партыйная дысцыпліна ў арганізацыі нізкая. Справа дайшла да таго, што ў апошнія месяцы сарваліся два партсходы з-за... няяўкі комуністаў. Гэты нечуваны выпадак прайшоў міма ўвагі гаркома і не стаў прадметам абмеркавання партыйнага камітэта. Спазненні на партыйныя сходы сталі тут сістэмай. Ёсць асобныя выпадкі невыканання комуністамі пастаноў парткома. Аднак, усе гэтыя сур'ёзнейшыя факты парушэння элементарных патрабаванняў партыйнага статута засталіся нікім не асуджанымі.

Дакладчык не сказаў поўным голасам аб памылках, дапушчаных парткомам, калі пачкамі выключаў з партыі чесных комуністаў. З 13 выключаных 8 адноўлены. Але сход не пачуў ад дакладчыка аб тым, як гэтыя таварышы зараз уцягваюцца парткомам у актыўнае партыйнае жыццё.

Выключна трывожны стан з ростам партарганізацыі. У такім буйнейшым рабочым калектыве за поўгода прынята ў кандыдаты партыі толькі 5 чалавек са спачуваючых і адзін — з комсамольцаў. Між тым, адна комсамольская арганізацыя налічвае ў сваіх радах 282 чалавекі.

Першы дзень спрэчак па справаздачы парткома пацвярджае выключна нізкі ідэйны ўзровень выступаючых. З 10 прамоўцаў большасць гаварыла аб дробных, непрынцыповых пытаннях, аб асабістых крыўдах. Амаль зусім адсутнічае крытыка і самакрытыка.

Р. ДОДЗІН.

ЗАЎСЁДЫ БЫЦЬ З МАСАМІ

(Барысаўская запалкавая фабрыка імя Кірава)

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу сакратара парткома барысаўскай запалкавай фабрыкі імя Кірава тав. Блінкова адкрыў парторг тав. Багдановіч, які падверг жорсткай крытыцы работу парткома. Ён расказаў, што партком адарвався ад мас, адгарадзіўся сваімі пастановамі, выканання якіх ніколі не правяраў.

— Тав. Блінкоў, — гаворыць тав. Багдановіч, — сказаў, што толькі дзве цэхавыя партгрупы працуюць добра, а астатнія «ледзь шавеляцца». Але ён не паказаў, што-ж зрабілі гэтыя дзве цэхавыя партгрупы для таго, каб павучыцца ў іх.

Тав. Блінкоў гаварыў тут, што фабрыка выконвае план. Але чаму ён не сказаў, што мы атрымліваем шмат пісем са скаргамі на дрэнную якасць нашай прадукцыі.

Тав. Слабодскі расказвае, што ён ужо год працуе парторгам, але не адчувае кіраўніцтва парткома. Не адчувае дапамогі. Калі выбралі парторгам тав. Кульгавага, яму абяцалі дапамогу, як чалавеку новаму на партыйнай рабоце. Але гэта толькі асталося абяцаннем.

Парторг тав. Еўдзёнка не адзін раз звяртаўся да сакратара парткома з пытаннем: з чаго пачаць? Блінкоў адказаў: «Ладна, складзі план работы». А як скласці план работы, з чаго пачаць, аб гэтым ён усё-ж не сказаў.

На фабрыцы сем цэхавых партгруп. Усе парторгі ў спрэчках выказаліся, што партком не кіраваў імі, не дапамагаў. Парторгі не склікаліся. З імі ніякай работы не вялося. А калі тав. Еўдзёнак звярнуўся ў партком з пытаннем, якую работу весці са спачуваючымі, аб чым з імі гаварыць, ён атрымаў адказ: «Раскажы што-небудзь аб школе».

— Ніхто не можа сказаць,—гаворыць тав. Еўдзёнак, — што партком ведае людзей. Няма выпадкаў, каб сакратар парткома пагаварыў з кім-небудзь індывідуальна, пацікавіўся яго асабістым жыццём.

— Сакратар парткамітэта,—гаворыць тав. Афільштэйн,—ведае тых людзей, якія прыходзяць у партком, а сам ніколі не займаецца справай індывідуальнага вывучэння комуністаў. Я працую на фабрыцы ўжо 27 год, але чулых, уважлівых адносін да сябе не бачу. Трэба прыслухоўвацца да радавых комуністаў, аказваць ім дапамогу.

За апошні час на фабрыцы прыступілі да вылучэння комуністаў і беспартыйных актывістаў на кіруючую работу. Новыя людзі, заняўшыя камандныя пасты ў цэхах, пачалі выводзіць фабрыку з прарыву і сур'ёзна занялісь ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва, якое шырока было разгорнута на фабрыцы. Як-жа партыйны камітэт адносіцца да гэтых вылучэнцаў, як дапамагае ім? Вось што расказвае т. Емельянава, вылучаная на работу кантралёра цэха:

— Мой шчапальны цэх у сакавіку недавыканаў плана, але наша начальства гэтым мала цікавіцца. Яны ў нас у цэху рэдкія госці, не прабуюць разабрацца на месцы у чым справа, дзе прычыны непаладкаў.

Статыстычныя выкладкі ў справаздачы сакратара парткома засланілі жывых людзей, іх палітычную ролю, іх патрабаванні, іх настроі. Дакладчык шмат талкаваў аб дастатковай колькасці агітатараў і прапагандыстаў, гаварыў, што партком агітатарамі і прапагандыстамі можа нават дапамагчы раённаму камітэту, але выступаючыя яго падправілі. Тав. Баран гаворыць, што з партыйнай прапагандай на фабрыцы справа абстаіць з рук вон дрэнна. Калі колькасна і ўсё добра, то якасць прапаганды пакідае жадаць многа лепшага.

На сходзе шмат гаварылі аб няўважлівых адносінах да агітатараў і прапагандыстаў. Тав. Афільштэйн гаворыць, што з ім, як з агітатарам, ніхто асабіста ніколі не гаварыў.

Партыйны камітэт не адчувае адказнасці за вядучую ролю комуністаў на фабрыцы. Тут налічваецца 800 чалавек стаханаўцаў, але характэрна, што ў дакладзе сакратара парткома літаральна ні аднаго слова не было сказана аб рабоце сярод іх. Даволі сказаць, што за 1938 год са стаханаўцамі не праведзена ні адной нарады, ні адной гутаркі. Партком не ўзначальвае стаханаўскі рух, не арганізоўвае яго, не дапамагае стаханаўцам у іх социялістычнай працы.

Сухі даклад сакратара парткома без аналізу, без самакрытыкі паказаў, што партком дрэнна ведае жыццё 115 комуністаў фабрыкі, што ён не ўдумваецца ў сваю работу, не абагульвае яе і таму не паспявае за палітычным ростам людзей, якімі ён павінен кіраваць. А фабрыка і партыйная арганізацыя выхавала рад выдатных большэвікоў. Каля 60 чалавек вылучана на кіруючую работу на фабрыцы. Амаль сто чалавек праводзяць вялікую агітацыйную і прапагандысцкую работу. А сакратар парткома, замест таго, каб расказаць аб жыцці хоць аднаго комуніста, паказаць яго рост, заняўся статыстычнымі выкладкамі.

— Я ўдзельнічаю першы раз у справаздачным сходзе, — гаворыць тав. Лускін,—мяне нядаўна прынялі ў партыю з комсамола. Для мяне гэты сход будзе памятнай датай. Але я вельмі здзіўлены, што ні сакратар парткома і ніхто з выступаючых не гаварыў аб кіраўніцтве комсамолам. Больш 500 чалавек моладзі працуе ў нас на фабрыцы. Ёсць выдатныя стаханаўцы, але комсамольская арганізацыя расце мала. На фабрыцы ў нас 245 комсамольцаў, і толькі 9 комсамольцаў прынята ў партыю.

Парторг і майстар цэха тав. Гільдэнберг гаворыць: «Нам, парторгам, інструктары РК не дапамагаюць у рабоце. Я яшчэ не бачыла ні аднаго інструктара райкома, не ведаю іх».

Асабліва рэзкай крытыцы падверглася раённая газета «Большэвік Барысаўшчыны». Газета зусім мала асвятляла партыйнае жыццё фабрыкі.

Партыйны сход фабрыкі імя Кірава быў ва многім паказальным не толькі для комуністаў фабрыкі, але і для раённага камітэта партыі, які мала кіраваў партарганізацыяй фабрыкі.

Новы партком выбран у колькасці 9 чалавек. Сакратаром парткома выбран тав. Блінкоў, намеснікам сакратара парткома выбрана тав. Журанкова—дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

В. ТАЛКАЧОЎ.

Гарматны разлік Н-скай казачай часці на тактычных заняткох. (Саюзфото).

С. БУГРОЎ

АРТЫЛЕРЫЯ У СУЧАСНАЙ ВАЙНЕ

Артылерыя, не гледзячы на наяўнасць новых сур'ёзных баявых сродкаў падаўлення, як танкі і авіяцыя, астаецца адным з важнейшых родаў войск у сучаснай вайне.

К. Е. ВАРАШЫЛАЎ.

Артылерыя даўно зарэкамендавала сябе як магутны сродак барацьбы з праціўнікам. Але поўны росквіт яе магутнасці пачаўся з часу імперыялістычнай вайны 1914—1918 гг.

Вось таблічка, якая дае ўяўленне аб росце артылерыі армій розных дзяржаў у годы імперыялістычнай вайны (без зенітнай артылерыі).

	У пачатку вайны.		К канцу вайны.	
Расія	7.088	гармат	12.299	гармат
Германія	8.404	»	25.000	»
Францыя	4.668	»	17.500	»
Англія	2.000	»	11.000	»
Італія	1.700	»	11.000	»

У імперыялістычную вайну страты ад артылерыйскага агню ў некалькі разоў перавышалі страты, якія раней неслі войскі ад агню пяхоты. Так, напрыклад, з усіх страт, панесеных рускай арміяй у вайну 1904—1905 гг., на агонь пяхоты прыходзіцца 85 проц., артылерыі — 14 проц., іншыя сродкі паражэння — 1 проц. А ў імперыялістычную вайну з усіх страт царскай арміі на агонь пяхоты прыходзіцца ўжо толькі 9,7 проц., артылерыі — ужо 78,3 проц., іншыя сродкі паражэння — 12 проц.

З першых-жа дзён вайны 1914—1918 гг. небывалы выдатак снарадаў парушыў усе меркаванні ваюючых дзяржаў. Вопыт ранейшых войн не мог ісці ні ў якое параўнанне з новай вайной. Так, напрыклад, Германія на працягу ўсёй франка-прускай вайны 1870—1871 гг. выдаткавала ўсяго 650.000 снарадаў, а за час сусветнай вайны — больш 300.000.000 снарадаў розных калібраў. На ўсіх франтах ваюючых краін было зроблена звыш мільярда артылерыйскіх выстралаў.

Вопыт імперыялістычнай вайны дае многа яркіх прыкладаў магутнасці артылерыйскага агню. Вось адзін з іх.

Досвіткам 13 жніўня 1917 года пад Вердэнам над нямецкімі пазіцыямі нечакана разразіўся ураган агню французскай артылерыі. Агонь знішчыў усё: людзей, кулямёты, мінамёты, гарматы, акопы, бліндажы, сховы. На працягу сямі сутак лютавала гэта стыхія агню і металу. Толькі непагода прымушала перапыняць кананаду, і тады на кароткія прамежкі сціхаў грукат гармат. 20 жніўня французская пяхота пад прыкрыццём завесы артылерыйскага агню атакавала пазіцыі немцаў і, панесшы нязначныя страты, заняла іх.

Якімі-ж сродкамі была дасягнута гэта перамога? На 17 кілометрах фронта наступлення французаў было сканцэнтравана 948 лёгкіх, 1.318 цяжкіх і 66 звышцяжкіх гармат (вялікай магутнасці), не лічачы акопнай (траншэйнай) артылерыі, налічваўшай 247 гармат. На кожны кілометр фронта прыходзілася ў сярэднім 152 гарматы. У часе бою было выпушчана 4 мільёны снарадаў агульнай вагою ў 120 тыс. тон. Для перавозкі гэтага грузу патрабавалася 240 чыгуначных паяздоў. На метр акопаў немцаў было выпушчана 6 тон снарадаў. Гэтыя лічбы даюць яснае ўяўленне аб сакрушальнай сіле артылерыйскага агню ў жнівеньскіх баях 1917 года пад Вердэнам.

Нямала прыкладаў рашаючай ролі артылерыйскага агню вядома і з часоў грамадзянскай вайны ў СССР. У кастрычніку 1918 года белыя банды генерала Краснова ўшчыльную падыйшлі да Царыцына. Навісала непасрэдная пагроза апорнаму пункту рэволюцыі на паўднёвым усходзе. Трэба было прыняць рашучыя меры, каб адкінуць ворага ад Царыцына. Камандуючы X арміяй таварыш Варашылаў загадаў сканцэнтраваць у раёне станцыі Варапонава магчыма больш артылерыі цэнтральнага баявога ўчастка і масай артылерыйскага агню абрушыцца на праціўніка.

Да 17 кастрычніка на ўчастку фронта працяжнасцю ў 5 кілометраў было сканцэнтравана 27 батарэй. Досвіткам 17 кастрычніка белабандыты пайшлі ў атаку. Яны разлічвалі прарвацца к Царыцыну. Але ўмела падрыхтаваны агонь чырвонай артылерыі перагарадзіў белым шлях. Шалёныя атакі белагвардзейскай конніцы і пяхоты былі адбіты. 1-я Комуністычная дывізія, дзве зводных брыгады і атрад царыцынскіх рабочых, падтрыманыя артылерыяй і ўзброенымі артылерыяй бронепаязамі, перайшлі ў контрнаступленне. Белыя адкаціліся назад.

Яшчэ ў канцы імперыялістычнай вайны на палях сражэнняў з'явіўся новы тэхнічны сродак — танкі. Да гэтага часу рэзка ўзрасла і авіяцыя. Гэтыя два новыя роды войск некалькі затмілі артылерыю. Неўзабаве пасля вайны сталі раздавацца галасы аб главенствуючым становішчы ў баю танкаў і авіяцыі; артылерыі-ж адводзілася другарадная роля. Але вопыт цяперашняй вайны ў Іспаніі і Кітаі апракінуў гэтыя памылковыя тэорыі. Ясна, што ні пяхота, ні танкі, ні авіяцыя без дапамогі артылерыі не могуць паспяхова рашаць ускладаемыя на іх задачы.

Палявы статут Чырвонай Арміі выразна гаворыць аб ролі і значэнні артылерыі ў баю. **«Артылерыя, — гаворыцца ў статуце, — уладае найвялікшай сілай і магутнасцю агню з усіх наземных родаў войск... Артылерыйскі агонь расчышчае шлях усім наземным войскам у наступленні і перагараджае шлях ворагу ў абароне».**

У наступацельным баю артылерыя надаўляе спачатку процітанкавыя гарматы і кулямёты абароны, разбурае перашкоды і фартыфікацыйныя пабудовы. Адначасова магутная і дальнабойная артылерыя падаўляе артылерыю праціўніка і разбурае яго тылы. Пасля таго, як артылерыя расчысціць шлях танкам, апошнія, прарабіўшы дротавых загародах праходы для пяхоты, урываюцца ў размяшчэнне абараняючагася. Частка танкаў, называемая групай «дальняга дзеяння», пад прыкрыццём рухомага агнявога вала артылерыі, праходзіць у тыл абароны і там громіць артылерыю, рэзервы, штабы і вузлы сувязі праціўніка, другая частка танкаў, так званая група «падтрымання пяхоты», пад прыкрыццём спецыяльна вылучаных гармат суправаджэння, вядзе за сабой пяхоту, знішчаючы агнявыя кропкі абароны.

Ва ўвесь час бою артылерыя сваім агнём падаўляе астаўшыяся ў глыбіні абароны праціўніка кулямёты і процітанкавыя гарматы, забяспечвае сваю пяхоту ад нападу танкаў і контратак пяхоты праціўніка, абстрэльвае артылерыю і авіяцыю ворага. Як толькі наступаючая пяхота прасунецца наперад настолькі, што са старых пазіцый яе ўжо цяжка падтрымаць, артылерыя мяняе свае пазіцыі, высоўваецца наперад і ўжо з новых пазіцый прадаўжае аказваць дапамогу пяхоце і танкам. Адступаючага праціўніка артылерыя нястомна праследуе агнём, высоўваючыся ў першыя эшалоны сваёй пяхоты. Такім чынам, ад пачатку і да канца наступальнага бою артылерыя суправаджае пяхоту і танкі, расчышчае ім шлях і забяспечвае поспех сражэння.

Не менш важную ролю адыгрывае артылерыя і ў абароне. Сучасная абарона павінна перш за ўсё быць здольнай адбіць наступленне танкаў. Асноўным касцяком процітанкавай абароны, у спалучэнні з інжынернымі процітанкавымі загародамі, з'яўляюцца малакалібравыя гарматы. Гэтыя гарматы размяшчаюцца ў паласе абароны (па фронту і ў глыбіню) у шахматным парадку, яны гатовы спаткаць танкі праціўніка ў любым напрамку. Паміма спецыяльных процітанкавых гармат, астатняя артылерыя таксама падрыхтоўвае агонь для сустрэчы танкаў на танканебяспечных напрамках.

Абарона арганізавана. Чакаецца наступаючы праціўнік. Артылерыя дальнімі агнявымі нападамі (ДАН), загадзя падрыхтаванымі, сустракае праціўніка на дыстанцыях у прадзелах свайго агню. Яна наносіць яму паражэнне яшчэ тады, калі ён у паходным парадку праходзіць вузкія месцы (масты, гаці) або выходзіць з населеных пунктаў і лясоў.

Калі праціўнік падыйдзе да абараняльнай паласы і пачне рыхтавацца да атакі, артылерыя перашкаджае яму ў гэтым, вядзе агонь па яго артылерыйскіх пазіцыях і скапленнях пяхоты, танкаў. У момант атакі ўся магутнасць артылерыі абароны абрушваецца спачатку на атакуючыя танкі праціўніка, а затым і на яго пяхоту, не спыняючы ў той-жа час агню па варожай артылерыі. Калі-ж праціўнік уварвецца ў размяшчэнне абароны, ён будзе знішчан контратакай пяхоты і танкаў пры падтрыманні артылерыі.

Веліка роля артылерыі ў процітаветранай абароне. Добрая зенітная артылерыя і знішчальная авіяцыя змогуць надзейна абараніць байпоў на фронце і мірнае насельніцтва ў тылу краіны ад налётаў паветранага ворага.

Магутнасць сучаснага ваенна-марскога флота вызначаецца не толькі колькасцю, быстраходнасцю і танажам асобных баявых караблёў, але і калібрам і дальнабойнасцю знаходзячыхся на іх гармат.

Ва ўсіх арміях капіталістычных дзяржаў зараз ствараецца артылерыя ўсіх відаў і калібраў, артылерыя дальнабойная і хуткастрэльная, буйнакалібравая і малакалібравая. У многіх арміях артылерыя з коннай цягі пераходзіць на механічную, артылерыя становіцца рухавай і быстраходнай.

Каб скласці сабе яснае ўяўленне аб магутнасці сучаснай артылерыі, дастаткова параўнаць дальнабойнасць гармат часоў імперыялістычнай вайны з дальнабойнасцю сучасных гармат. Па даных зарубежнай літаратуры, у імперыялістычную вайну дывізіённая артылерыя мела гарматы з найбольшай дальнасцю стральбы ў 11,4 кілометра, гаубіцы — 10,2 кілометра. Сучасная дывізіённая артылерыя мае гарматы з дальнабойнасцю 14,5 кілометра, гаубіцы — 13,2 кілометра. Корпусная артылерыя мела гарматы, страляўшыя на 12,7 кілометра і гаубіцы — на 11,5 кілометра. Цяперашняя корпусная артылерыя мае на ўзбраенні гарматы дальнасцю агню ў 20 кілометраў і гаубіцы — 19,5 кілометра. Артылерыя вялікай магутнасці ў імперыялістычную вайну складалася з гармат, дальнабойнасць якіх дасягала 18,5 кілометра, сучасныя-ж цяжкія гарматы могуць весці агонь на 52 кілометры, цяжкія гаубіцы — на 27 кілометраў.

Будаўніцтву ўзброеных сіл і ўмацаванню баявой магутнасці нашай социялістычнай радзімы партыя, урад, асабіста таварыш Сталін удзяляюць велізарную ўвагу. Артылерыя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў будучай вайне пакажа сябе самай магутнай, самай дальнабойнай, самай хуткастрэльнай і рухавай. Трапным знішчальным агнём яна збераж мільёны жыццяў байцоў на фронце і мірных жыхароў у глыбокім тылу. Яна дапаможа забяспечыць бесперабойную работу нашых фабрык і заводаў і спакойнае жыццё ў нашых гарадах і пасёлішчах. Яна адыграе велізарную ролю ў тым, каб праціўнік, які асмеліцца падняць руку на нашу дзяржаву, быў раздаўлен і знішчан.

ПАДРЫХТОУКА ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР

УЗМАЦНІЦЬ АРГМАСАВУЮ РАБОТУ СОВЕТАЎ

Зацверджанне VIII сесіяй ЦВК БССР «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» паклала пачатак падрыхтоўчай работы да выбараў у соцыялістычны парламент нашай рэспублікі.

Разгортванне агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў — адна з асноўных задач райвыканкомаў, гарадскіх і сельскіх советаў.

Па няпоўных вестках, па 59 раёнах рэспублікі арганізавана і працуе 17678 гурткоў, у якіх займаецца звыш 482 тысяч чалавек. На прадпрыемствах, у калгасах, соўгасах і ва ўстановах праведзена 4690 сходаў, прысвечаных растлумачэнню Канстытуцыі і выбарчага закона БССР. Прысутнічала на сходах 421 тысяча выбаршчыкаў.

Рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя і ўсе працоўныя з вялікай цікавасцю вывучаюць Канстытуцыю і выбарчы закон БССР. Шырока разгорнута агітацыйна-масавая работа ў Смалявіцкім раёне. На торфазаводах, у калгасах і арцелях раёна арганізаваны і працуюць 660 гурткоў, якімі ахоплена 13.842 чалавекі. Кіраўнікамі палітгурткоў падабрана 700 чалавек агітатараў і прапагандыстаў, прычым 100 чалавек вылучаны ўпершыню на агітацыйна-прапагандысцкую работу. Апрача таго, падабрана 800 чытчыкаў і бяседчыкаў з актыва рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі; яны праводзяць гутаркі, арганізоўваюць чыткі на кватэрах выбаршчыкаў.

У сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет БССР на прадпрыемствах, у калгасах і ў соўгасах разгортваецца соцспаборніцтва.

У апошнія месяцы наглядаецца прыліў аднаасобнікаў у калгасы. У Забалацкім сельсавеце ўступіла ў калгасы 11 аднаасобных гаспадарак, у Юр'еўскім — 9, у Драчкаўскім — 20 і т. д. Усяго па раёну ўступіла ў калгасы 63 аднаасобныя гаспадаркі.

За апошні час праведзена вялікая работа па вылучэнню на кіруючую совецкую і партыйна-комсамольскую работу раду людзей, якія паказалі сябе ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР. За 2 месяцы вылучана на адказную работу 360 чалавек, у тым ліку на пасаду старшынь калгасаў — 37 чалавек, старшынь сельсветаў — 10 чалавек, на адказную партыйна-комсамольскую работу — 7 чалавек, загадчыкаў аддзеламі РВК — 5 чалавек і т. д. Трактарыстка-стахановка торфазавода «Чырвоны сцяг» тав. Камышова, якая працавала агітатарам у часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР, зараз вылучана на пасаду старшыні Пліскага сельсавета. Са сваімі новымі абавязкамі т. Камышова спраўляецца добра. Настаўнік Кляніцкай школы тав. Шэўчанка працаваў у часе выбараў сакратаром участковай выбарчай камісіі, а зараз вылучан на пасаду загадчыка райана. Стахановка-камбайнерка тав. Шчурак, якая была агітатарам, вылучана на работу загадчыка райсабеза.

Нядрэнна разгорнута агітацыйна-масавая работа ў Добрушскім раёне. Тут працуе зараз звыш 274 гурткі, у якіх больш 9000 чалавек вывучаюць Канстытуцыю і выбарчы закон БССР. Кіраўнікі ўсіх гэтых гурткоў вылучаны з ліку нізавога партыйнага і совецкага актыва. Апрача гэтага, вылучаны 384 агітатары і прапагандысты з раённага актыва, якія прымацаваны да выбарчых участкаў і праводзяць там масава-растлумачальную работу сярод выбаршчыкаў.

У Багушэўскім раёне ў сувязі з падрыхтоўкай да выбарчай кампаніі шырока разгортваюцца соцспаборніцтва і ўдарніцтва. У калгасах раёна арганізавана звыш 800 стахановскіх звенняў.

У Віцебскім горсавеце на выбарчых участках арганізавана 276 палітгурткоў, у якіх налічваецца звыш 5.000 слухачоў, галоўным чынам хатніх гаспадынь. Заняткі ў гуртках праводзяцца па 4—5 раз у месяц. Добра працуе хатняя гаспадыня член горсавета тав. Белякова. Яна арганізавала 7 гурткоў хатніх гаспадынь. У гэтых гуртках прыступлена ўжо да вывучэння выбарчага закона БССР. Тав. Белякова арганізоўвае калектыўныя паходы ў тэатры, кіно, экскурсіі на прадпрыемствы і ў музеі.

Актыўна рыхтуюцца да надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет БССР працоўныя Палескай вобласці. У Дамановіцкім раёне працуе 141 гурток, дзе выбаршчыкі вывучаюць «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», міжнароднае і ўнутранае становішча БССР. Арганізаваны 10-дзённыя курсы агітатараў і прапагандыстаў. 30 чал. ужо скончылі курсы і накіраваны ў калгасы. У Журавіцкім раёне для вывучэння выбарчага закона і Канстытуцыі БССР арганізавана 10 агіткалектываў, якія яднаюць 400 агітатараў, арганізавана 350 палітгурткоў, у якіх налічваецца звыш 8.000 чалавек. У Петрыкоўскім раёне ў кожным калгасе працуюць гурткі па вывучэнню выбарчага закона. Створана 29 агіткалектываў, якія яднаюць 450 агітатараў.

Аднак, неабходна адзначыць, што не ўсе райвыканкомы, гарадскія і сельскія советы скарыстоўваюць вялікі вопыт арганізацыйна-масавай работы, набыты ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР, яны не арганізоўваюць па-большэвіцку падрыхтоўчай работы да надыходзячай выбарчай кампаніі.

Праверка паказала, што ў Барысаўскім раёне райвыканкомы і сельскія советы самаўхіліліся ад агітацыйна-масавай работы. Арганізаваныя гурткі працуюць бясплана, многія не забяспечаны кіраўнікамі. У Бярэзінскім раёне ў трох сельсветах — Пагосцкім, Неганіцкім і Белічанскім — зрываюцца заняткі гурткоў з прычыны адсутнасці кіраўнікоў.

У асобных калгасах Бягомльскага раёна арганізаваныя гурткі зусім спынілі работу. Так, у калгасе «Чырвоная Бярэзіна» арганізавана 9 гурткоў, а праходзяць заняткі толькі ў двух. У Талачынскім раёне не прыцягваецца да прапагандысцкай работы ўвесь актыў агітатараў, вырашы ў час выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Не ўсюды выконваюцца ўказанні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб неабходнасці захавання ўсёй маемасці былых выбарчых участкаў. Абураючыя факты выяўлены ў Жодзінскім, Драчкоўскім і Пятровішкім сельсветах Смалявіцкага раёна. Тут па віне старшынь былых выбарчых камісій разбурылі кабіны, фанеру ў большасці парасцягвалі. Расцягваецца і іншае абсталяванне — лямпы, чырвоная матэрыя, шырмы.

Совецкія арганізацыі БССР павінны максімальна ўзмацніць падрыхтоўку да выбарчай кампаніі. Справа гонару кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў, змагацца за паспяховае іх правядзенне.

СТАСЕЛЬКА,
інструктар аргаддзела Прэзідыума ЦВК БССР.

СТУДЭНТЫ-АГІТАТАРЫ Ў КАЛГАСАХ

Беларускі дзяржаўны універсітэт паслаў у Пухавіцкі раён брыгаду студэнтаў-агітатараў для дапамогі ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Студэнты тт. Кавалёў, Фердэр, Есіповіч, Астапенка пабывалі ў калгасах Суцінскага, Балоцкага і Блужскага сельсветаў, праводзілі гутаркі аб міжнародным становішчы, падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і выкананні дзяржаўных паставак. У гэтых сельсветах студэнтамі праведзены семінары вясковых агітатараў.

Ф.

У калгасах БССР пачалася пасадка бульбы. НА ЗДЫМКУ: першая брыгада калгаса «3-ці рашаючы», Кавалёўскага сельсавета, Бабруйскага раёна за пераборкай насеннай бульбы.
Фото Я. Салавейчыка.

ПАРУШАЮЦЬ ПРАВІЛЫ АГРАТЭХНІКІ

ЧАШНІКІ. Некаторыя калгасы раёна распачалі сяўбу збожжавых і ільну. Калгасамі пасеяна 122,6 гектара збожжавых культур і 71 гектар ільну. Але ў першыя-ж дні сяўбы ў некаторых калгасах парушаюцца правілы агратэхнікі. Калгасы Лазукоўскага сельсавета пасеялі 31 гектар збожжавых культур непратручаным насеннем. 5 гектараў непратручаным насеннем пасеялі калгасы Чарэйскага сельсавета.

Устанавіўшаеся цёплае надвор'е дазваляе калгасам разгарнуць сяўбу ў масавым парадку. Аднак старшыні многіх калгасаў чамусьці чакаюць дырэктыў зверху.

Вельмі марудна праходзіць падрыхтоўка глебы пад пасеў яравых культур. У калгасе «Перамога», Пачаеўскага сельсавета прабаранавана толькі 25 гектараў зяблівага ворыва і ўзмешана 15 гектараў. Зусім мала падрыхтавана глебы ў калгасах імя Куйбышэва, Цяпінскага сельсавета, і «Новыя Тараскі», Дварэцкага сельсавета.

Не ўключыўся як след у веснавую сяўбу трактарны парк. Трактары прастойваюць. У Вятненскай МТС трактары прыходзіцца паўторна рамантаваць. У калгасе «Чырвона Зорка» трактар на рамонце прастаяў 7 дзён. Не ўсе трактарысты ведаюць нормы выпрацоўкі. Да аднаго трактара дырэкцыя Вятненскай МТС (дырэктар т. Басячэнка) прымацавала двух маладых нявопытных трактарыстаў, дапамога якім не аказваецца. Вопыт работы лепшага трактарыста - стахановца Веціорца, які ўжо на сваім трактары ўзараў 20 гектараў глебы, прабаранаваў 45 і пракультываваў 8 гектараў, не перадаецца астатнім трактарыстам.

Недаацэньваюць дырэктары МТС радковай сяўбы. Трактарныя сеялкі Вятненскай МТС не адпраўлены на ўчасткі, нават не закончан іх рамонт. Сеялка Пачаеўскай МТС стаіць яшчэ на чыгуначнай станцыі.

Аграномы МТС і райза амаль не бываюць у калгасах, не дапамагаюць ім у прымяненні агратэхнічных мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне ўраджайнасці.

Е. КАЗЛОЎ.

У ЧАКАННІ ДОБРАГА НАДВОР'Я

МАГІЛЕЎ. (Спец. кар. «Звязды») Ужо некалькі дзён стаіць добрае надвор'е, спрыяючае разгортванню масавай сяўбы. Але ў Магілеве чамусьці не спяшаюцца. У раённым зямельным аддзеле нават не ведаюць, што робіцца ў калгасах. Раённыя арганізацыі разаслалі па сельсветах тэлефанаграму аб разгортванні масавай сяўбы і на гэтым супакоіліся.

— Сеюць у раёне ўжо ўсе калгасы, — так упэўнена заяўляе загадчык райза тав. Батура.

Але ў сапраўднасці гэта далёка не так. Узяць, напрыклад, Пашкоўскі сельсавет. Ні ў адным калгасе не прыступілі да сяўбы, хаця ёсць дастатковая падрыхтаваная глебы. Як зараз высвятляецца, у гэтым сельсавеце рашылі масавую сяўбу адкласці на некалькі дзён. Напрыклад, калгас «VII з'езд Советаў» намеран пачаць сяўбу толькі 25 красавіка.

Дрэнна працуе Казіміраўская МТС. Частыя прастоі трактараў затрымліваюць нармальны ход веснавых работ. У калгасе імя Сталіна трактар 16 красавіка ўвесь дзень стаяў: папсавалася завадная ручка. Бясконца псуецца трактар, які даслалі ў калгас імя Варашылава. Трактар не забяспечан святлом. Няма нават газавых ліхтароў. Гэта перашкаджае начной рабоце.

С. ЛЯСНЕЎСКІ.

У ЗВЯНЕ МАЦВЕЯ КАРПАВІЧА ШЭРШНЯ

Мацвей Карпавіч Шэршань — звеннявы па бульбе—вышаў з хаты. Яркае веснавое сонца павольна выплывала з-за лесу. Яго праменні залацілі верхавіны дрэў, мільгацелі срэбрам на густых хвалях ракі. Дзень абяцаў быць цёплым і сонечным.

«Трэба канчаць прасушку бульбы»,— падумаў Мацвей, накіроўваючыся да калгаснай канюшні. Ля канюшні Іван Козел і Іван Сініца запрагалі коней у плугі. Прывітаўшыся з імі, Мацвей спытаў:

— Ну як, хлопцы, скончыце сёння заворваць угнаенне?

— Абавязкова скончым, — адказаў Сініца.

Пагутарыўшы з калгаснікамі, Мацвей Карпавіч пашоў у пуню, дзе прасушвалася бульба. Бульба была насыпана на драўляную падлогу тонкім пластом. Мацвей з калгаснікамі старанна перабіраў яе і выкідаў усю нягодную. Некаторая бульба была ўжо нямногa завяўшы і пусціла маленькія расткі.

— Гэта ранняя бульба «чырвоная роза», — тлумачыў нам Мацвей Карпавіч, — мы яе яравізавалі і яна зараз гатова да сяўбы.

Бульба была чыстая, буйная.

Мацвей Карпавіч — сапраўдны майстар высокіх ураджаяў. Яго поспехі па высокай ураджайнасці бульбы вядомы далёка за межамі раёна.

У канцы 1935 года Мацвея Шэршня вызначылі звеннявым па бульбе. У адказ на заклік Марыі Дземчанка ён абяцаў у 1936 годзе дабіцца не менш як 500 цэнтнераў бульбы з гектара на рэкордным участку. Работа была цяжкая і адказная. На дапамогу Мацвею прышлі аграномы райземаддзела і навуковыя прапаўнікі інстытута сельскай гаспадаркі. У выніку — абяцанне было выканана.

Мацвея Карпавіча, як лепшага звеннявога, калгаснікі накіравалі дэлегатам на Усебеларускі з'езд Советаў, а потым і на VIII Усесаюзны Надзвычайны з'езд Советаў.

У 1937 годзе звяно Мацвея Карпавіча дазгарнула работу яшчэ шырэй і атрымала ўраджай бульбы ў 625 цэнтнераў з гектара на рэкордным участку і на 209 цнт. на ўсёй плошчы ў 7 гектараў.

Да сяўбы бульбы ў гэтым годзе звяно разгарнула падрыхтоўку ўжо даўно. Уся плошча пад пасевы была ўзарана на зіму, былі ўнесены мінеральныя ўгнаенні. Усю зіму звяно зарыхтоўвала торф, торфагноевыя і торфафекальныя кампосты. Угнаенне падрыхтавалі ў дастатковай колькасці, з разлікам 40 тон торфу, 20 тон гною, 10 тон фекаліяў, 3 цэнтнеры фасфарытнай мукі, 3 цэнтн. суперфасфата і 2 цэнтнеры калійнай солі на кожны гектар. Для падкормкі бульбы ў часе росту калгаснікі сабралі многа гноевай жыжы.

У гэтым годзе звяно Мацвея Карпавіча засявае 11 гектараў бульбы, з якіх абяцае атрымаць не менш як па 300 цэнтнераў. У ліку гэтай плошчы будзе засеян рэкордны ўчастак у два гектары, з якога Мацвей абавязаўся атрымаць не менш як па 1000 цэнтнераў добраякаснай бульбы з гектара.

Каб дабіцца такога небывалага яшчэ ўраджаю, Мацвей скарыстоўвае вопыт мінулых год, скарыстоўвае вопыт перадавых калгасаў рэспублікі. Ён працуе не пакладаючы рук, заўсёды правярае работу калгаснікаў і калгасніц. Самыя адказныя работы, як рассеў мінеральных угнаенняў і пасадка бульбы, — робіць сам.

І вось зараз, закончыўшы работу, ён ідзе на поле, каб прыняць работу калгаснікаў, заворваючых угнаенне. Лепшыя калгасніцы Марфа Шэршань, Аўдоцця Дубейь, Хіма Дайняк і Юста Баты старанна раскалачвалі гной, а Іван Сініца і Іван Козел заворвалі яго. Работу яны ўжо закончылі і рыхтаваліся ехаць дамоў. Мацвей Карпавіч уважліва аглядзеў увесь участак і застаўся вельмі задаволены: работа была выканана на выдатна.

Толькі пасля гэтага Мацвей Карпавіч вярнуўся дамоў адпачываць. Назаўтра яго чакала такая-ж напружаная работа у барацьбе за выкананне свайго абавязацельства — дабіцца 1000 цэнтнераў бульбы з гектара.

С. РОЗУМ,
калгас «Большэвік», Бытчанскага сельсавета, Барысаўскага раёна.

ПЕРАДМАЙСКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

20 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ У ФОНД 1 МАЯ

Уступаючы ў перадмайскае соцспаборніцтва, калектыў скурзавода «Большэвік» (Менск) абавязаўся сабраць у фонд пролетарскага свята 25 рацыяналізатарскіх прапаноў.

Стахановцы і рабочыя завода з гонарам выконваюць сваё абавязацельства. На 20 красавіка паступіла ўжо 20 прапаноў.

Майстар клееварнага цэха тав. Малчан унёс прапанову: устроіць кранікі да трохкорпуснага вакуумапарата, што значна палепшае якасць прадукцыі і аблягчае працу вакуумшчыкаў. Ён-жа прапанаваў новую канструкцыю каромысла для пад'ёмных вагонетак, што папярэдзіць ад няшчасных выпадкаў пры карыстанні пад'ёмнікамі. Гэтыя дзве прапановы прыняты дырэкцыяй завода і праведзены ў жыццё. Аўтар атрымаў прэмію.

Каштоўную прапанову ўнеслі рабочыя транспартнага цэха, па якой павышаецца прадукцыйнасць механізаванай падачы торфу ў качагарку на 60—70 проц. Гэта прапанова таксама ўжо рэалізавана.

Рацыяналізатарскія прапановы ўнеслі кузнец тав. Негнявішкі, абгоншчык Якабсон, майстар Афраймовіч, слесар Пашкоўскі і інш.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ЛЕСАРУБАЎ

ЖЫТКАВІЧЫ. Рыхтуючыся да першамайскага свята і выбараў у Вярхоўны Совет БССР, лесарубы і шоферы Жыткавіцкага леспрамгаса з дня ў дзень павышаюць сваю выпрацоўку.

Лесарубы тт. Серыкаў і Паўлюкоў Н. на загатоўцы дроў выконваюць сваю дзённую норму на 383 проц., Серыкаў Т., Барыкаў А.—на 360 проц., сталыя возчыкі Месніковіч і Дзербянёў — на 240 проц., стахановец-шофер Мешчанскі Аляксандр — на 120 проц.

М. РАЙХМАН.
С. РЖЭВУЦКІ.

ПЕРАМОГА СТАХАНАЎКІ СІМАНОЎСКАЙ

Завёртчыца бабруйскай кандзіцерскай фабрыкі «Чырвоны харчавік» тав. Сіманоўская ўзяла на сябе абавязацельства да першамайскага свята абагнаць вядомую стахановку маскоўскай фабрыкі «Красный Октябрь» тав. Юдзіну, якая завёртвае за змену 90 кілограмаў цукерак (норма 51 кілограм).

Днямі тав. Сіманоўская дабілася сваёй першай перамогі. Яна завярнула за змену 90 кілограмаў цукерак.

300 ПРОЦ. НОРМЫ

16 красавіка на заводзе «Лукскае» (Клобінскі раён) пачалася торфаздабыча. У першы-ж дзень работы спільшчык Бешалеў Васіль выканаў сваю норму на 300 проц. Замест 7 тысяч торфацаглін ён расклаў 21 тысячу.

ПРАВІЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ УГНАЕННІ

—о—
І. ВЛАСЕНКА
—о—

Партыя і ўрад стварылі выключна спрыяючыя ўмовы для атрымання ў гэтым годзе высокіх ураджаяў. Калгаснаму сялянству нашай рэспублікі саюзным урадам аказана велізарная дапамога машынамі, высокасортным насеннем і т. д. Аказана вялікая дапамога і мінеральнымі ўгнаеннямі. Аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ніколі не меці магчымасці так добра ўгнойваць глебу, як гэта цяпер робяць калгасы.

Задача цяпер заключаецца ў тым, каб усе мінеральныя і арганічныя ўгнаенні правільна скарыстаць на соцыялістычных палях. Стахановцы соцыялістычнай сельскай гаспадаркі атрымліваюць выдатныя ўраджаі, у прыватнасці, таму, што яны навучыліся правільна скарыстоўваць мінеральныя і арганічныя ўгнаенні, якімі ўдосталь насычаны нашы калгасы. І таму цяпер, калі ў калгасах рэспублікі разгарнуліся палявыя работы, калі з кожным днём шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва за высокі сталінскі ўраджай, — вельмі важна, каб калгаснікі ведалі як правільна, эфектыўна скарыстоўваць угнаенне на палях.

Да ліку самых моцных і ўсебакова дзейнічаючых мясцовых угнаенняў адносіцца гной. Калгасы і соўгасы ўсямерна павінны павялічыць колькасць гною. Ужыванне торфу на падсціл не толькі павялічвае колькасць гною, але і паляпшае яго якасць. Аб гэтым свядчыць тое, што ўчасткі, угноеныя торфяным гноем, даюць вышэйшы ўраджай, чым участкі, угноеныя адным саломеным гноем.

Гной патрэбна добра захоўваць. Для гэтага трэба будаваць спецыяльныя гноехавальнікі і жыжазбіральнікі. Гной у гноехавальніках павінен ляжаць шчыльна і захоўвацца ў вільготным стане. Па ім неабходна рабіць сістэматычнае напластаванне хоць-бы тонкіх пластоў торфу, што ў значнай ступені змяншае страту пажыўных матэрый (азота).

Эфектыўнасць дзеяння гною на павышэнне ўраджаю ў многім залежыць ад правільнасці скарыстання яго. Вывезены на поле вясной і летам гной ні ў якім разе не павінен аставацца незавораным. У адваротным выпадку ён выветрываецца і трапіць шмат важнейшых пажыўных матэрый.

Да ліку моцных і вельмі эфектыўных угнаенняў адносіцца таксама і гноевая жыжа. Яе патрэбна скарыстоўваць як у якасці вадкага ўгнаення, так і для палівання торфу пры кампаставанні. Для збору гноевай жыжы на скотных дварах павінна быць пабудавана воданепранікальная падлога са спецыяльнымі стокамі ў жыжахавальнікі.

Ва ўмовах Беларусі адной з галоўнейшых крыніц арганічных угнаенняў з'яўляецца торф. Яго неабходна скарыстоўваць як на падсціл жывёле, так і для загатоўкі торфагноевых, торфафекальных і іншых кампостаў. Торф можна ўжываць і ў якасці непасрэднага ўгнаення. Для гэтых мэт яго трэба загадзя нарыхтоўваць і добра праветрываць.

Найлепшыя вынікі торф як угнаенне дае пры кампаставанні яго з гноем. Пры летняй і веснавой загатоўцы торфагноевых кампостаў бяруць на адну частку гною ад адной да чатырох частак торфу. Калі-ж кампастуецца добра разлажыўшыйся торф, то колькасць яго можна значна павялічыць.

Кампосныя кучы ўкладваюцца шырынёй у 2 метры і вышынёй ад 1 да $1^1/_2$ метра. Даўжыня кучы залежыць ад колькасці кампастуемага матэрыялу. Зверху кампоснай кучы неабходна насыпаць пласт торфу. Кампост трэба перыядычна паліваць гноевай жыжай і некалькі разоў пералапачваць. Торфагноевыя кампосты набываюць аднастайную масу праз 5—6 месяцаў, пасля чаго іх можна скарыстоўваць на ўгнаенне.

Каб атрымаць большую колькасць угнаенняў, трэба кампаставаць розныя адкіды. Апрача гэтага, можна кампаставаць торф з дамешкамі вапны, фасфарытнай мукі і гноевай жыжы. Апрача масавай загатоўкі торфагноевых і іншых кампостаў, неабходна звярнуць увагу і на загатоўку торфафекальных кампостаў.

У справе ўзбагачэння глебы азотам выключная роля належыць зялёнаму ўгнаенню — лубіну і іншым сідэратам (зялёным угнаенням). Глебавыя і кліматычныя ўмовы Беларусі дазваляюць шырока ужываць зялёныя ўгнаенні ва ўсіх раёнах, уключаючы і паўночныя. Лубін на зялёнае ўгнаенне высяваецца ў папаравых палях ці падсяваецца пад іншыя культуры. А таксама яго трэба высяваць і пасля зняцця ранніх зернавых культур.

Зялёныя ўгнаенні з'яўляюцца пераважна азотнымі. Таму адначасова з ужываннем зялёнага ўгнаення неабходна ўнясенне ў глебу і калійна-фасфатных угнаенняў. З фасфатных угнаенняў пад лубін на зялёнае ўгнаенне найлепш ужываць фасфарытную муку, якая параўнаўча добра ўсвайваецца лубінам.

Фасфарытная мука ўносіцца з разліку 5—6 цэнтнераў на гектар і калійная соль — 1,5—2 цэнтнеры. Калійна-фасфатныя ўгнаенні неабходна ўносіць і пры сяўбе лубіну і іншых сідэратаў на насенне. Пры пасевах сідэрацыйных культур неабходна праводзіць прывіўку клубянковых бактэрый пры дапамозе нітрагіна, што вядзе да павелічэння ўраджайнасці сідэрацыйных культур.

Ужыванне торфу і мінеральных угнаенняў пад лубін дае магчымасць атрымліваць найбольш рацыянальнае спалучэнне яго з зялёным угнаеннем. У рэзультаце — зялёнае ўгнаенне актывізуе разлажэнне ў глебе торфу.

Торф і калійна-фасфатныя ўгнаенні пад лубін лепш уносіць восенню пад зяблевае ворыва, ці ранняй вясной, заворваючы іх плугам. Сяўба лубіну павінна быць ранняй. Ранняя сяўба забяспечвае высокі ўраджай, з'яўляецца адным з галоўных прыёмаў барацьбы са шкоднікамі і хваробамі лубіну.

Унясенне ў глебу арганічных угнаенняў трэба праводзіць у папаравых і прапашных палях. У папаравым полі лепш уносіць добра праветраны торф— з нізінных ці пераходных балот, торфагноевыя і іншыя кампосты. Таксама добра ўносіць і торфагноевую сумесь. Пры адсутнасці торфу ўносіцца і адзін гной. Арганічныя ўгнаенні ўносяцца з разліку 30—40 тон на гектар.

Адначасова з унясеннем арганічных угнаенняў у папаравым полі праводзіцца вапнаванне (пры ўмовах патрэбнасці ў вапне на гэтай глебе), ці фасфарытаванне.

У прапашным полі лепш уносіць торфагноевыя і торфафекальныя кампосты, торфагноевую сумесь ці адзін гной. Арганічнае ўгнаенне ўносіцца з разліку 30—40 тон на 1 гектар. Калійныя ўгнаенні ўносяцца ў прапашным кліне разам з арганічнымі ўгнаеннямі з разліку 1—1,5 цэнтнера на адзін гектар. Пры недахваце арганічных угнаенняў можна ўносіць 20—30 тон арганічнага ўгнаення, 1,5 цэнтнераў калійнай солі і 2,5—3 цэнтнеры суперфасфату на адзін гектар.

Пры ўмовах сяўбы канюшыны пад яравыя зернавыя, якія ідуць пасля слаба ўгноенага арганічным угнаеннем бульбяніча, неабходна ўнясенне арганічных угнаенняў пад зернавыя яравыя з падсевам канюшыны.

Вельмі эфектыўным прыёмам з'яўляецца павярховае ўнясенне калійна-фасфатных угнаенняў па канюшыне ў пачатку вясны. Угнаенні ўносяцца з разліку 3—4 цэнтнеры суперфасфату і 1,5—2 цэнтнеры калійнай солі, ці 6—8 цэнтнераў попелу на 1 гектар. Павярховае ўнясенне калійна-фасфатных угнаенняў па канюшыне ў першую чаргу неабходна рабіць на ўчастках канюшыны, пакінутай на насенне.

Пры ўнясенні ўгнаенняў пад лён на канюшынішча (пры добрых ураджаях канюшыны) уносяцца 3—4 цэнтнеры суперфасфату і 1,5 цэнтнера калійнай солі з наступнай падкормкай ільну азотным угнаеннем з разліку, прыкладна, 20 кілограмаў азота на адзін гектар. Калі-ж ураджай канюшыны быў слабы або калі папярэднікам ільну з'яўляецца мякаць, то да калійна-фасфатных угнаенняў трэба дадаць азотных з разліку 30—45 кілограмаў на 1 гектар.

На кіслых глебах пад лён мэтазгодна ўносіць сумесь фасфарытнай мукі і суперфасфату з разліку 1,5—2 цэнтнеры суперфасфату і 3—4 цэнтнеры фасфарытнай мукі на 1 гектар. Мэтазгодна таксама ўнясенне калійнай солі разам з попелам (1 цэнтнер калійнай солі і 3—4 цэнтнеры попелу).

Калійна-фасфатныя ўгнаенні пры вясеннім скарыстанні пад яравыя культуры ўносяцца ранняй вясной і глыбока заворваюцца плугам або культыватарам пры ўмовах, калі не праводзіцца веснавое пераворванне глебы.

Доследамі ўстаноўлена, што пры веснавым унясенні калійна-фасфатных угнаенняў ранняе ўнясенне і глыбокае заворванне іх плугам дае значна большую эфектыўнасць у параўнанні з дзейнасцю тых-жа ўгнаенняў пры позднім унясенні з мелкай задзелкай баранай. Адсюль вынік: пры веснавым унясенні калійна-фасфатных угнаенняў апошнія павінны ўносіцца ранняй вясной і глыбока задзелваецца плугам ці культыватарам.

Пад лён неабходна скарыстоўваць і мясцовыя арганічныя ўгнаенні. Добра расклаўшыйся торф уносіцца з разліку 20—30 тон на гектар, торфагноевы ці торфафекальны кампост — 15—20 тон, птушыны памёт і гноевая жыжа— 5—8 цэнтнераў на гектар. Торф і кампосты пад лён лепш уносіць увосень, заворваючы іх плугам. Птушыны памёт і гноевая жыжа ўносяцца вясной.

Пры ўнясенні пад лён торфу, кампостаў і іншых арганічных угнаенняў неабходна дабаўляць калійна-фасфатныя ўгнаенні.

Апрача асноўнага ўнясення ўгнаенняў да часу сяўбы, неабходна праводзіць і падкормку азімых і яравых культур у часе іх росту. Але-ж трэба адзначыць, што падкормка ні ў якім разе не павінна замяніць сабой асноўнае ўнясенне ўгнаенняў да часу сяўбы. Падкормка азімых і яравых культур з'яўляецца дадатковым мерапрыемствам, якое дапамагае рэгуляваць нармальнае харчаванне раслін у часе іх росту.

Толькі поўнае і правільнае скарыстанне арганічных угнаенняў у спалучэнні іх з мінеральнымі забяспечыць атрыманне высокага ўраджаю.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПІСЕМ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Роўна 6½ месяца назад рэдакцыя газеты «Звязда» накіравала ў Аршанскі РК КП(б)Б матэрыял селькора для тэрміновага расследвання і прыняцця адпаведных мер. Матэрыял вельмі важны і, безумоўна, патрабаваў хутчэйшага рэагавання. У ім аўтар сігналізаваў, што ў 1934 годзе супроць жадання калгаснікаў адбылося зліццё трох калгасаў у адзін калгас «Луч асвятлення», што дала адмоўныя вынікі. У калгасе наглядаліся факты разбазарвання калгаснай маемасці, з-за існуючай безгаспадарчасці загінула значная частка жывёлы, і рад іншых фактаў.

Вядома, што ў кіраўніцтве Аршанскага раёна доўгі час знаходзіліся ворагі народа, якія шкодзілі і падрывалі магутнасць калгасаў. Прамы абавязак новых кіраўнікоў аршанскіх раённых арганізацый — чула прыслухоўвацца да кожнага сігнала селькора.

Відаць, Аршанскі РК КП(б)Б прытрымліваецца іншай думкі. Атрымаўшы селькораўскае пісьмо, там зусім не спяшаюцца з яго расследваннем. Рэдакцыйныя напамінкі, патрабаванні, тэлефонныя званкі! — нічога.

Пасля некалькіх доўгіх і сур'ёзных размоў і перапіскі сакратар РК КП(б)Б тав. Чарнякоў заявіў нарэшце: «Пісьмо недзе загубілася, расшукаем».

Вось другі прыклад. Рэчыцкі РК КП(б)Б дасланыя яму для расследвання і рэагавання пісьмы перасылае таму, на каго яны напісаны. Так абстаіць справа з пісьмом пад загалоўкам: «Варожае гняздо». У ім аўтар сігналізуе, што ў калгасе «Пабядзіцель», Артукоўскага сельсовета, заселі людзі, якія развальваюць калгас, разбазарваюць калгасную маемасць.

Замест таго, каб самім выехаць і на месцы праверыць правільнасць указаных фактаў, РК КП(б)Б перасылае пісьмо старшыні гэтага-ж сельсовета тав. Волкаву, які пачынае па-свойму ка яго «рэагаваць». Волкава, як аказалася, перш за ўсё цікавіла, хто аўтар заметкі. Ён дамагаецца выявіць проязішта аўтара, які асмеліўся крытыкаваць яго (Волкава) работу, і прыцягнуць «паклёпніка» да адказнасці.

Па-свойму таксама «рэагаваў» на дасланае пісьмо рэдакцыі і дырэктар Бабруйскага лесакамбіната. У пісьме, якое паступіла ў рэдакцыю, аўтар піша аб дрэннай рабоце загадчыка клуба лесакамбіната тав. Астанковіча В. Дырэктар не палічыў нават патрэбным праверыць гэты факт, а выклікае да сябе Астанковіча і загадвае яму даць тлумачэнне для рэдакцыі газеты «Звязда» аб сваёй рабоце.

Апошні пасылаў гэта тлумачэнне на 5 аркушах, у якім усяляк імкнецца апраўдаць сябе, зваліць усю віну на аб'ектыўныя ўмовы.

Наша партыя заўсёды вучыць чула прыслухоўвацца да сігналаў і скарг прапоўных і патрабуе ад кожнага кіраўніка своечасовага разгляду і рэагавання на іх.

Вышэй прыведзеныя факты паказваюць, аднак, што Аршанскі і Рэчыцкі райкомы партыі, а таксама дырэкцыя бабруйскага лесакамбіната яшчэ да гэтага часу не зразумелі велізарнага значэння ўдзелу шырокіх мас у выкрыцці і выпраўленні існуючых недахопаў і знішчэнні дапушчаных памылак у рабоце тых ці іншых арганізацый.

Я. С.

На III Усебеларускай алімпіядзе самадзейнага мастацтва сістэмы Белкаапрамсовета. НА ЗДЫМКУ: ансамбль танца рабочых торфарцеляў імя 16 чырвоных партызан, Смілавіцкага раёна і імя XVII парт'езда Рудзенскага раёна выконваюць беларускі танец «крыжачок». Фото С. Грына.

НАПЯРЭДАДНІ 1-га МАЯ

ФАБРЫЧНАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

МАГІЛЕЎ. Калектыў рабочых шаўковай фабрыкі імя Куйбышэва актыўна рыхтуецца да Першага мая. Работніцы адбелачнага цэха вышываюць на шоўку гербы СССР і БССР. Малююцца вялікія панно «Станцыя Паўночны полюс» і «Дружба народаў СССР».

Гурткі мастацкай самадзейнасці спаборнічаюць на лепшае выступленне ў часе святочных канцэртаў. Новыя песні развучвае хор з 40 чалавек, новыя танцы рыхтуе балетны гурток. У дні свята фабрычны драматычны гурток пакажа п'есу «Сям'я Волкавых». У клубе рабочыя развучваюць калектыўныя песні. Распаўсюджана 10 тысяч экземпляраў песень — «Масква-майская» і «Кахоўка». Напярэдадні свята праводзяцца ўнутрыфабрычныя стралковыя спаборніцтвы.

СВЯТА БУДЗЕ ВЯСЕЛЫМ І РАДАСНЫМ

Пярвічная партыйная і комсамольская арганізацыі калгаса «Ленінскі шлях», Бабіцкага сельсовета, пачалі падрыхтоўку да Першага мая. У брыгадах і гуртках па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» праводзяцца гутаркі аб Першым маі, аб поспехах сацыялістычнага будаўніцтва, якіх дабілася наша ордэнаносная БССР.

На агульных сходах калгаснікі абмеркавалі сацыялістычны дагавор паміж Свяцілавіцкім і Веткаўскім раёнамі і ўключылися ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай. Выклікан на сацыялістычнае спаборніцтва суседні калгас імя Шмідта.

К дню першамайскіх свят здадуць нормы на значок «Варашылаўскі стралок» першай ступені 20 калгаснікаў.

Лепшыя ўдарнікі і стаханаўцы ў дні першамайскіх свят паедуць на аўтамашыне ў горад Гомель у тэатр імя Леніна.

НАХАБЦАЎ.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ПЕРАДМАЙСКАЕ СПАБОРНІЦТВА БАЙЦОЎ І КАМАНДЗІРАЎ БВА

Ва ўсіх падраздзяленнях часці, якой камандуе маёр Бычкоўскі, шырока разгорнута перадмайскае сацыялістычнае спаборніцтва. Спаборнічаюць аддзяленні, узводы, падраздзяленні.

Маладыя байцы часці натхнёны імкненнем да дня прыняцця ўрачыстага абяцання прысці з выдатнымі паказальнікамі, заваяваць права несці на першамайскім парадзе баявыя сцягі часці.

Аддзяленні тт. Краснаруцкага і Агрызко ўжо маюць добрыя паказальнікі. На заліковай баявой стральбе ўсе байцы гэтых аддзяленняў стралялі толькі на «добда» і «выдатна».

Комсамолец, малады камандзір аддзялення Ачыраў за добрую падрыхтоўку аддзялення і за ўзорнае ўтрыманне баявых коней атрымаў падзяку ад камандзіра часці. Сярод байцоў і камандзіраў разгорнута вялікая падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Агітатары растлумачваюць Канстытуцыю і выбарчы закон БССР, ярка паказваюць перамогі, дасягнутыя ордэнаноснай рэспублікай.

У працэсе ўсёй гэтай работы лепшыя байцы і камандзіры ўпягваюцца ў рады ленінскага комсамола. Прыняты ў комсамол выдатнікі баявой вучобы тт. Анікін, Дакучынаў, Сталярэнка і інш.

Н. НЕХАЕЎ.

***

Шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва сярод курсантаў Н-скай часці (камісар тав. Марозаў).

Наперадзе, узначальваючы спаборніцтва, ідзе ўзвод, якім камандуе комуніст тав. Мартынаў. У мінулым беспартыйны тав. Мартынаў у Чырвонай Арміі прайшоў выдатную школу. У гэтай школе ён атрымаў добрую пажыццёвую прафесію і сапраўдную большэвіцкую загартоўку. Свае веды, свой вопыт тав. Мартынаў умела перадае байцам. У яго падраздзяленні вырас малодшы камандзір-выдатнік тав. Губанаў, растуць курсанты Сапронаў, Абдрахманаў, Ежоў, Манахаў. Узвод тав. Мартынава цвёрда рашыў пяршынства не здаваць, да Першага мая—дня прыняцця чырвонай прысягі — прыйсці з вышэйшымі паказальнікамі ў часці.

Многія малодшыя камандзіры, рыхтуючыся да Першага мая, рашылі прасіць камандаванне пакінуць іх на звыштэрміновай службе ў радах РСЧА. Хадайніцтвы камандзіраў — перадавікоў у спаборніцтве тт. Патэнчэнкава, Марозава, Міронава, Кузняцова, Чырыкава і Адзінцова задаволены камандаваннем часці.

П. СМІРНОЎ.

У ГОНАР ПЕРШАГА МАЯ

Учора ў Менску пачаліся гарнізонныя стралковыя спаборніцтвы, якія праводзяцца менскім Домам Чырвонай Арміі імя маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава.

Спаборніцтвы прысвечаны міжнароднаму пролетарскаму святу — Першаму мая. У іх будуць удзельнічаць 20 мужчынскіх і 21 жаночая каманды.

Сярод удзельнікаў спаборніцтва — лепшыя стралкі менскага гарнізона: маёр тав. Чэрноў, старшыя лейтэнанты: Пятроў, Камінскі, Тішкевіч, Корміліцын, Белякоў, Магро, ваентэхнік тав. Грэкаў і іншыя майстры меткай стральбы з рэвальвера і вінтоўкі.

Сярод удзельнікаў спаборніцтва жанчын — выдатныя стралкі тт. Кузьміна, Рыбінская, Жэрабяцьева, Мурашка, Рэпіна, Смірагіна, Гурэвіч, Банькова, Крэсік і інш. Жанчыны ўпершыню будуць спаборнічаць у стральбе з баявых вінтовак. Для пераможцаў устаноўлены індывідуальныя і камандныя прызы.

Капітан РЭПІН.

ЗАКОНЧЫЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ПРАМКААПЕРАЦЫІ

19 красавіка вялікім канцэртам закончылася 3-я Ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці прамсловай каапераціі. Каля 650 чалавек з розных гарадоў і раёнаў рэспублікі на працягу 3-х дзён дэманстравалі сваё майстэрства ў выкананні народных танцаў, класічных і народных песень, музыкальных твораў, акрабатычных практыкаванняў.

Заключны канцэрт пачаўся паказам першага акта балета «Красны мак» — Гліера ў выкананні харэаграфічнага калектыва менскай культбазы Белкаапрамсовета.

Алімпіяда выявіла рад таленавітых выканаўцаў. Лепшыя ўдзельнікі алімпіяды прэміруюцца. Большасць калектываў, якія прымалі ўдзел у алімпіядзе, выступяць з паказам мастацкай самадзейнасці на мясцах—на першамайскіх вечарах, на выбарчых участках, у калгасах.

КОРАТКА

* Актыўная падрыхтоўка да ўсесаюзнай алімпіяды чыгуначнікаў разгарнулася сярод удзельнікаў калектыва мастацкай самадзейнасці Гомельскага чыгуначнага вузла. Чыгуначны камітэт Беларускай чыгункі арганізаваў для кіраўнікоў гурткоў самадзейнасці экскурсію ў Маскву і Ленінград для азнаямлення з вопытам работы перадавых калектываў гэтых гарадоў.

* Дзве новыя аптэкі хутка адкрыюцца ў Журавіцкім раёне. У Прапойскім раёне поўным ходам ідзе будаўніцтва новай аптэкі і пераабсталяванне старых. Па Магілеўскай вобласці ў гэтым годзе на будаўніцтва і пераабсталяванне аптэк і магазінаў «Санітарыя і гігіена» будзе выдаткавана 737 тысяч рублёў.

* 157 экземпляраў розных газет атрымлівае вёска «Вялікая сліва» (Слуцкі раён) Газеты паступаюць у кожны калгасны двор. Апрача таго яны ёсць у чытальні калгаснага клуба. На вёсцы арганізавана 17 гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона БССР.

НЕЧУВАНАЯ ГРУБАСЦЬ

Гэты выпадак адбыўся нядаўна. У дзіцячы магазін № 1 (па Ленінскай вуліцы) зайшоў грамадзянін В.

Трымаючы пад пахай скрутак, ён звяртаецца да прадаўшчыцы т. Рапапорт:

— Вось я купіў у вашым магазіне брукі, яны аказаліся крыху малымі. Ці немагчыма было-б замяніць іх, або вазьміце назад.

— Што, брукі? Назад?.. Дзе-ж твае былі вочы, калі ты купляў іх?

— Ды вы-ж улічыце...

— Ідзіце адсюль, грамадзянін, і не дурыце мне галаву. Я з вамі і гаварыць не хачу.

Грамадзянін В. з сумным тварам накіраваўся да загадчыка магазіна т. Рубенчыка. Неласкава сустрэў яго апошні. Але т. Рубенчык ўсё-ж быў вымушаны даць сваё распараджэнне, каб тав. Рапапорт узяла назад брукі і выплаціла грамадзяніну В. грошы.

— Шкада, што такія грубыя працаўнікі яшчэ дзе-ні-дзе стаяць за прылаўкамі совецкіх магазінаў, — абурана сказаў грамадзянін В.

— Ах ты, кулацкая морда, — усклікнула Рапапорт. — Як ты асмеліўся назваць мяне грубай?!

І пасыпалася грубая лаянка, дзікія зневажанні. Атрымаўшы грошы, грамадзянін В. вышаў з магазіна № 1, нібы з гарачай лазні.

І сапраўды шкада, што такіх выпадкаў праяўлення нечуванай грубасці, што ганьбяць званне совецкага грамадзяніна, як у магазіне № 1, у гандлёвай сетцы ёсць яшчэ нямала, а дырэктары магазінаў і Наркамгандаль часта глядзяць на гэта скрозь пальцы.

Ал. САЛАУЕЎ.

РОЗЫГРЫШ КАМАНДНАГА ПЯРШЫНСТВА ПА ШАХМАТАХ І ШАШКАХ

Днямі ў Менску закончыўся розыгрыш каманднага пяршынства па шахматах і шашках сярод каманд ВНУ і тэхнікумаў горада.

У спаборніцтве прыняла ўдзел 200 мацнейшых шахматыстаў і шашыстаў. Першае месца па шахматах заваявала каманда БДУ, другое — Педагагічны інстытут.

Па шашках першае месца заняла каманда Інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышэва.

ЗДАРЭННІ

* **Сімуляцыя аграблення.** Калгаснік калгаса «Большэвік», Каралішчавіцкага сельсовета (Менскі раён), Даніленка Н. П. раніцой 13 красавіка на пары калгасных коней прыехаў на менскі базар для продажу сваёй бульбы. Прадаўшы бульбу, ён да ночы п'янстваваў і ў нецвярозым стане паехаў дамоў. Не даязджаючы аднаго кілометра да вёскі Новы Двор, ён на калёсах заснуў, а ў гэты час коні звярнулі з дарогі і павярнулі ў балота, дзе і загрузлі. Праз некаторы час Даніленка, прачнуўшыся, пачаў ратаваць коней. Аднаго ён выратаваў, а другога не здолеў вывесці з балота, і конь загінуў.

Для таго, каб скрыць сваю віну ў падзежы каня, Даніленка прышоў у Менскае раённае аддзяленне міліцыі, дзе заявіў, што яго па дарозе аграбілі, аднялі 65 рублёў грошай, авязалі рукі і прывязалі да калёс, што ён не змог кіраваць коньмі, якія ў выніку зацягнулі калёсы ў балота. Аднак у часе следства ён прызнаўся ў хлуслівай заяве аб аграбленні яго, каб не адказаць за загінуўшага калгаснага каня.

Даніленка прыцягваецца да адказнасці.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр 21 красавіка —спектакля няма 22/IV—прэм'ера ПАРТЫЗАНЫ

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» «ЗАКЛЮЧЕННЫЕ»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» «ГРОЗА»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» ПЕРШАЕ КАХАННЕ

Дзіцячы гукавы кінотэатр закрыт на рамонт да 1 мая

Гукавы кінотэатр «Спартак» АПОШНЯЯ НОЧ

Кінотэатр «Навіны дня» закрыт на рамонт да 1 мая

„МЕНПРАМГАНДАЛЬ"

У МАГАЗІНАХ „Менпрамгандаля"
№ 44—Ленінская 22
ПРАЦУЕ З 10 ДА 10 г. ВЕЧАРА
№ 3—Ленінская 9/2
ПРАЦУЕ З 9 ДА 9 г. ВЕЧАРА

З 24 па 30 красавіка 1938 года ў гор. Менску ПРАВОДЗІЦЦА
МІЖРАЁННЫ КІРМАШ,
У ЯКІМ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ УСЕ БУДНЕЙШЫЯ ГАНДЛЮЮЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ гор. МЕНСКА.
НА КІРМАШЫ БУДЗЕ ШЫРОКІ ВЫБАР ТАВАРАЎ:
ГАТОВАЙ ВОПРАТКІ, АБУТКУ, МАНУФАКТУРЫ, ГАЛАНТАРЭІ, РЭЧЫ ХАТНЯГА ЎЖЫТКУ і інш. тавары.
Усяго будзе завезена тавараў на суму 2 мільёны 100 тысяч руб. Для прывозу на рынкі сельскагаспадарчай прадукцыі калгасы і калгаснікі могуць патрабаваць ад кіраўніцтва рынкамі аўтамашыну за плату.
КАЛГАСНІКІ І АДНААСОБНІКІ!
ПРЫМІЦЕ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У МІЖРАЁННЫМ КІРМАШЫ. АРГАНІЗУЙЦЕ МАСАВЫ СУСТРЭЧНЫ ВЫВАЗ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ НА КІРМАШ.
МЕНГОРГАНДАЛЬ.

МЕНСКІ ЛІКЁРНА-ГАРЭЛАЧНЫ ЗАВОД
ГАЛАВЛІКЕРВОДКА
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА МЕНСКА І РАЁНАЎ,
ШТО ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ «ГЛАВЛІКЕРВОДКІ», І АРГАНІЗАЦЫЯХ, ГАНДЛЮЮЧЫХ ГАРЭЛКАЙ І ГАРЭЛАЧНЫМІ ВЫРАБАМІ
ПРЫМАЕЦЦА
пароженая гарэлачная ПАСУДА.
Здавайце пароженую пасуду!
АБ УСІХ ВЫПАДКАХ АДМАЎЛЕННЯ АД ПРЫЕМУ ПАСУДЫ ПАВЕДАМЛЯЙЦЕ ПА АДРАСУ: гор. Менск, вул. Варашылава, 15, Лікёрна-гарэлачны завод. (Тэлефон 21-185).

На падставе пастановы Эканомсовета СНК СССР ад 11 сакавіка 1938 года за № 116 і загада Наркамгандля БССР ад 13 красавіка 1938 г. за № 200
РЭСПУБЛІКАНСКІЯ КАНТОРЫ БЕЛПРАМГАНДЛЯ І БЕЛХАРЧГАНДЛЯ
ЛІКВІДУЮЦЦА.
Асобы і арганізацыі, якія маюць ПРЭТЭНЗІІ да рэспубліканскіх кантор БЕЛПРАМГАНДЛЯ і БЕЛХАРЧГАНДЛЯ, АБАВЯЗАНЫ ПРАД'ЯВІЦЬ ІХ ЛІКВІДКОМУ (Менск, Совецкая, 33) НЕ ПАЗНЕЙ 28 КРАСАВІКА 1938 г.
Пасля сканчэння гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца НЕ БУДУЦЬ.
ЛІКВІДКОМ.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛ. № 21-845

СССР НАРКАМХАРЧПРОМ БССР
„БЕЛПРАМХЛЕБ"
(Менск, Совецкая вул., 29/9)
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ
АД УСТАНОЎ, ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, АСОБНЫХ РАЁНАЎ, СЕЛЬПО І АСОБНЫХ ГРАМАДЗЯН З ДАСТАЎКАЙ
НА ВЫСОКАРЭЦЭНТУРНЫЯ БЫРАБЫ:
ТАРТЫ, КЕКСЫ, ПІРОЖНЫЯ, СУХАРЫ, ПЯЧЭННЕ, ПРАНІКІ, ЗДОБЫ, СУШКІ, КАНДЗІЦЕРСКІЯ ВЫРАБЫ І РОЗНЫЯ САРТЫ ХЛЕБА.
СПЕЦЫЯЛЬНЫ ДЗІЦЯЧЫ АСАРТЫМЕНТ.

ЗАКАЗЫ ПРЫМАЮЦЬ ХЛЕБАЗАВОДЫ І МАГАЗІНЫ БЕЛПРАМХЛЕБА Ў МЕНСКУ, ВІЦЕБСКУ, ГОМЕЛІ, МАГІЛЕВЕ, ОРШЫ, БАРЫСАВЕ, БАБРУЙСКУ, МАЗЫРЫ, ПОЛАЦКУ, ЖЛОБІНЕ, РЭЧЫЦЫ, СЛУЦКУ.
ТАКСАМА МОЖНА ЗДАВАЦЬ ЗАКАЗЫ ПРАЗ КАНТОРУ ХЛЕБАЗБЫТ ТЭЛЕГРАФНА І ПА ТЭЛЕФОНАХ №№ 23-648, 21-421 І ПРАЗ ФІРМЕНЫЯ МАГАЗІНЫ «ГАЛОЎ ХЛЕБА».

Даводзіцца да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што на падставе рашэння дырэктыўных органаў ад 23 сакавіка 1938 года, ПАРТЫЙНАЕ ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б «БЕЛПАРТВЫДАВЕЦТВА»
ЛІКВІДУЕЦЦА,
ЯК САМАСТОЙНАЕ ВЫДАВЕЦТВА, І ПЕРАХОДЗІЦЬ у склад Даяржаўнага выдавецтва Беларусі. Прэтэнзіі прымаюцца да 26 красавіка 1938 года.
Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
Адрас ліквідкома: Менск, вуліца Пушкіна, Дом друку, партвыдат ЦК КП(б)Б.
ЛІКВІДКОМ.

17 красавіка па дарозе Менск—Пухавічы ЗГУБЛЕНА з аўтамашыны фанерная скрыня з оптыкай (аправы і сцёклы).
Знайшоўшага просьба звярнуць за ўзнагароду па адрасу: Бабруйск, Социялістычная, 112, Санмагу № 1.

У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікаў
У ДНІ ПЕРАДСВЯТОЧНАГА ГАНДЛЮ
МЕНСАЮЗУНІВЕРМАГ — Совецкая 43
І ДЗІЦЯЧЫ ФІЛІЯЛ — рог вул. Ленінскай і Совецкай
ПАВЯЛІЧЫЛІ ЧАСЫ ГАНДЛЮ НА 2 ГАДЗІНЫ Ў ДЗЕНЬ.
З 16 ПА 30 КРАСАВІКА
Універмаг працуе з 9 гадзін раніцы да 8 гадзін 30 м. веч.
ДЗІЦЯЧЫ ФІЛІЯЛ працуе з 10 гадзін раніцы да 9 гадз. 30 м. веч.
МЕНСАЮЗУНІВЕРМАГ.

Уп. Галоўлітбела № К—5500. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 49. К., Л., Ш.